незалежная газета
№ 20 (618) 27 мая 2009
www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Ігар Рачкоўскі: запомніце гэты твар**

Старонка 3

**План Абамы, які пераверне свет**

Старонка 4

**Якасная адукацыя для вашых дзяцей**

Старонка 15

## У НУМАРЫ

**Гудбай, сацыялізм**

Урад прапануе яшчэ адзін ліберальны крок у эканоміцы — чарговае зніжэнне падатковай нагрузкі ад 1 чэрвеня. **Старонка 2.**

**«Бомба» для Мілінкевіча**

Звязаныя з Расіяй сілы разгарнулі інфармацыйную атаку на лідэра Руху за Свабоду. **Старонка 6.**

**Няміга: вінаватыя былі**

але ніхто не быў пакараны. 10 гадоў таму, 30 мая 1999 году ў цісканіне ў пераходзе да метро «Няміга» загінулі 53 чалавекі. **Старонка 5.**

**Чарнасоценны дапаможнік па «белорусской» гісторыі**

Андрэй Павач піша пра новы дапаможнік для сярэдніх школаў аўтарства Якава Трашчанка. **Старонка 7.**

**Маршруты па Беларусі: Нараўляншчына**

Новы артыкул з цыклу. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 11.**

**«Наша Ніва» і ARCHE ў Гродне**

**28 мая ў Гродне ў памяшканні Таварыства беларускай школы (вул.Будзённага, 48а-44)** пройдзе прэзентацыя спецыяльнага нумару часопісу ARCHE, прысвечанага БНР. Удзел возьмуць шэф-рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Дынько, а таксама гісторыкі Алесь Пашкевіч і Андрэй Чарнякевіч. **Пачатак а 18.30.**

# Будаўнік у банку

Пра кіраўніка Нацбанку Пятра Пракаповіча ў цыкле «Палітбюро–2009» піша **Аляксандр Фядута**.

З Пракаповіча ўжо даўно ніхто не смяецца. Хоць яго старамодна-наменклатурныя касцюмы, тоўстыя акуляры, што робяць яго погляд безабаронным, і ўсмешка вечна вінаватага ва ўсім двоечніка — такая зручная мішэнь для кпінаў. Але, імаверна, нават самыя жорсткія крытыкі рэжыму проста не ведаюць, у чым можна звінаваціць гэтага чалавека.

Пятро Пракаповіч, чалавек-скарагаворка, персанаж анекдотаў — адзіны непрафесіянал ў атачэнні Аляксандра Лукашэнкі, які змог стаць прафесіяналам і ператварыцца ў функцыю. Гэтая функцыя — «будаўнік у банку».

### У барацьбе з Багданкевічам

Ён быў дэпутатам Вярхоўнага Савету XII склікання. Прафесійны будаўнік, на зыходзе савецкай улады Пётр Пракаповіч зрабіўся будаўнічым начальнікам у Брэсцкай вобласці. Гэта велічыня. Дырэктары будтрэстаў разам з пракурорамі і галоўурачамі ва ўсе часы былі паважанымі і выбіранымі. Вось спадара Пракаповіча і выбралі.

У кожнага дэпутата ВС быў свой «канёк». У Пятра Пракаповіча такім канём была барацьба са Станіславам Багданкевічам — тагачасным старшынёй Праўлення Нацыянальнага банку.

Багданкевіча тузалі ўсе, нават лянівыя. Левыя крытыкавалі за тое, што ён тармазіць уваходжанне Беларусі ў рублёвую зону, правыя — за маруднае ўвядзенне нацыянальнай валюты. Багданкевіча цягалі ў Авальную залу, публічна мардавалі яго, паказваючы ўсяму беларускаму народу, хто тут у нас самы кепскі.

Але прафесару Багданкевічу гэта было не ў навіну. Ён адкрыта смяяўся са сваіх апанентаў. Асабліва — з Пракаповіча, які, было бачна, не ведаў у тыя часы нават асноваў макраэканомікі.

Затое Пракаповіч ведаў мікраэканоміку.

**Працяг на старонцы 8.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Дык навошта нам тая інтэграцыя?

28 траўня ў Мінск прылятае прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін. Візіту папярэднічала артпадрыхтоўка з беларускага боку.

Уладзімір Пуцін прылятае для ўдзелу ў пасяджэнні рады міністраў саюзнай дзяржавы. У праграме візіту значыцца сустрэча з беларускім калегам Сяргеем Сідорскім, каб абмеркаваць ход рэалізацыі сумеснага беларуска-расійскага антыкрызіснага плану, а таксама галоўная сустрэча — з Аляксандрам Лукашэнкам.

Прыезд расійскага прэм'ера ў Мінск супаў з чарговым абвастрэннем у беларуска-расійскіх адносінах. Першым рэзкую заяву зрабіў Аляксандр Лукашэнка. Прычынай сталася адмова Расіі крэдытаваць пастаўкі беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі.

На мінулым тыдні Сідорскі з Пуціным сустракаліся ў казахскай Астане ў рамках пасяджэння рады прэм'ер-міністраў краінаў СНД. Адкрываючы сустрэчу, расійскі прэм'ер паабяцаў, што праз тыдзень у яго чакаецца з Сідорскім «грунтоўная размова пра саюзніцкія адносіны».

**Працяг на старонцы 3.**



**Падарожжа Мюнхгаўзена, або Калі прыдумалі Усходнюю Еўропу?**

Гісторыя ў «НН». **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Гудбай, сацыялізм

**Урад прапануе яшчэ адзін ліберальны крок у эканоміцы — чарговае зніжэнне падатковай нагрузкі ад 1 чэрвеня.**

Урад прапануе знізіць агульную падатковую нагрузку яшчэ на 1,3% ад ВУП. Змены ў падатковае заканадаўства маюць быць унесеныя тэрмінова, ад 1 чэрвеня. Плануецца адмяніць абаротны падатак, які адлічваецца ў фонд падтрымкі сельгасвытворцаў, 5-адсоткавы мясцовы збор з продажаў, 3% мясцовага збору са звышпрыбытку на развіццё рэгіёну і на 4% зменшыць падатак на прыбытак.

У якасці кампенсацыі плануецца павялічыць стаўку падатку на дададзеную вартасць (ПДВ) з 18% да 22%, паведамляе «Інтэрфакс».

Пра ўсё гэта на пасяджэнні Нацыянальнай рады па працоўных і сацыяльных пытаннях — кансультацыйнага органу з удзелам дырэктарату — заявіў першы віцэ-прэм’ер Уладзімір Сямашка.

Як мяркуе эканаміст Аляксандр Чубрык, урад усур’ёз задумаўся над пытаннем прыцягнення капіталу. Падвышэнне ПДВ з 18% да 22% узамен за скасаванне іншых падаткаў падаецца эканамісту апраўданым крокам, таму што сёлета паступлenні ў бюджэт за кошт падаткаў скараціліся на 11% у параўнанні з мінулым годам – з 51 да 40%. Аднак у выніку росту ПДВ «цэны на імпартныя тавары вырастуць», — мяркуе А.Чубрык.

Па яго словах, ініцыятыва ўраду хутчэй за ўсё будзе рэалізаваная, бо ніякіх абавязальніцтваў па ўтрыманні стаўкі ПДВ перад МВФ наша краіна не мае.

Беларусь на вачах ператвараецца ў краіну з вельмі прарынкавым падатковым заканадаўствам. Нагадаем, што ад 1 студзеня быў уведзены адзін з найніжэйшых ў Еўропе лінейны падаходны падатак — 12%.

Усё гэта спрыяе станаўленню прыватнай ініцыятывы, паляпшае магчымасці для развіцця бізнэсу і ўзбагачэння прадпрымальных людзей. Беларусь уступае ў этап прыспешанага развіцця капіталізму.

**Сямён Печанко**




**30 былых вязняў сабрала радыё «Свабода» на прэзентацыю сваёй кнігі «Адзін дзень палітвязня». На фота злева направа: былы міністр замежнаэканамічных сувязяў Міхаіл Марыніч (сядзеў у 2004—2006) і былы прэм’ер Міхаіл Чыгір (сядзеў у 1999—2000).**

### «Еўрасець» можа сысці з беларускага рынку

Буйная расійская кампанія згортваецца. Яна сышла з рынкаў Балтыі, Узбекістану, Малдовы. Да канца чэрвеня выраішыцца лёс 75 салонаў у Беларусі. У першым квартале 2009-га продажы мабільнікаў у свеце скараціліся на 13%.

### Улады прагназуюць хвалю крадзяжоў

Кіраўнікі Ваўкавыскага раёну атрымалі ліст за подпісам намесніка старшыні райвыканкаму па ідэалогіі Ігара Кашкевіча. У ім канстатуецца, што ў рэгіёне адчуваюцца наступствы крызісу — істотнае зніжэнне рэальных прыбыткаў насельніцтва. Занепакоенасць выклікае прагноз на павелічэнне колькасці крадзяжоў.

### Такі прыедзе

3—5 чэрвеня Беларусь наведае кіраўнік МЗС Ізраіля Авігдор Ліберман. Мяркуецца, што ён запрапануе беларускім уладам адмовіцца ад шчыльных кантактаў з Сірыяй. Узамен Беларусь можа атрымаць выгадныя прапановы ад Ізраілю. Ліберман ужо наведваў Мінск у лютым з неафіцыйным візітам.

### Берастравіцкі Бэндэр

У ноч з 23 на 24 мая 25-гадовы жыхар Берастравіцкага раёну, які працаваў на пункце пропуску «Берастравіца», сказаў калегам, што ненадоўга выйдзе. І больш у пункт мытнага афармлення не з’явіўся. А з сабой прыхапіў 22 тыс. даляраў, 57 тыс. еўра, ды яшчэ злотых і рублёў. Яго шукаюць.

## СЦІСЛА

### Праспект Маркса пераймянуюць у Скарыны

Такое рашэнне прыняў Полацкі гарсавет.

### «Бацькаўшчына» адхрысцілася ад «Беларускага дому»

Намесніца старшыні Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Ніна Шыдлоўская абвергла заявы Уладзіміра Някляева і Алеся Пашкевіча пра далучэнне гэтай арганізацыі да парасонавай структуры «Беларускі дом». «Беларускі дом» блізкі да Казуліна, а «Бацькаўшчына» не хоча ўцягвацца ў палітыку. «Каму і дзеля чаго выгадна ўводзіць у зман кіраўнікоў дыяспары? — пытаецца Н.Шыдлоўская.

### 2-я лінія метро пераходзіць на пяцівагонікі

Такімі ўжо карыстаюцца на першай лініі сталічнага метрапалітэну.

### Выстава заснавальніка секты ў цэнтры Мінску

З 15 па 24 мая ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны доўжылася выстава «Светлыя фарбы тайгі». «Аўтары прац — мастакі сібірскага духоўнага экапасялення «Обитель Рассвета», — гаварылася ў рэкламе. Між тым «Обитель Рассвета» — гэта секта, заснаваная ў Краснаярскім краі былым міліцыянерам Сяргеем Таропам. Тароп заявіў, што ён Сын Божы на Зямлі. Назваў сябе Вісарыёнам — рэінкарнацыяй Хрыста.

**МБ; ЗП; АГ БелаПАН, радыё «Рацыя», Народныя навіны Віцебску**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, хто такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

## Дзякуй

**К.Р.** з Свіслацкага раёну.
**Аляксандру П.** з Жлобінскага раёну.
**Аляксандру А.** з Нясвіжскага раёну.
**Яўгенію К.** з Шклоўскага раёну.
**Л.А.** з Полацкага раёну.
**Ігару Н.** з Гомелю.
**В.В.** з Гродна.
**С.Б.** з Астравецкага раёну.
**Аляксандру П.** з Брэсту.
**Аляксандру Р., Уладзіміру З.** з Пінскага раёну.
**Мікалаю В.** з Бярозаўскага раёну.
**Івану К., Анастасу С.** з Мінскага раёну.
**Лідзіі А., С.Ц.** з Баранавіцкага раёну.
**Альберту С., С.Ц., Ірыне В., А.К., Т.К., М.Ж., Сяргею М., С.В., Уладзіміру Ч., Максіму Т., А.С., Юрыю А., І.Л., В.Г., А.Б., А.С., Л.Ж., Надзеі І.** з Мінску.

# Ігар Рачкоўскі: запомніце гэты твар

Саракагадовы кіраўнік Памежнага камітэту робіць фенаменальную кар’еру.



БЕЛТА

Да фігураў кшталту Ігара Рачкоўскага ўважліва прыглядаюцца заходнія дыпламаты.

Уладзімір Навумаў быў адпраўлены ў адстаўку з пасады міністра ўнутраных справаў яшчэ ў пачатку красавіка, а новы кіраўнік ведамства дагэтуль не прызначаны. Ходзіць мноства чутак, хто можа ўзначаліць гэтую сілавую структуру. Сярод найбольш імаверных кандыдатаў называецца прозвішча старшыні Дзяржаўнага памежнага камітэту Ігара Рачкоўскага.

І.Рачкоўскі досыць нечакана ўзначаліў Памежны камітэт у красавіку 2007 г., пасля звальнення з пасады генерал-лейтэнанта Аляксандра Паўлоўскага, які праз нейкі час паехаў паслом у Парыж.

Цікава, што на момант прызначэння Рачкоўскі быў усяго толькі палкоўнікам, а яго намеснікам быў прызначаны генерал-маёр Вадзім Зайцаў. Лагічней было б зрабіць наадварот, бо і досведу ў Зайцава было болей, ну і чын. Зайцава прыбераглі на нейкі час. Праз год ён атрымаў прызначэнне на пасаду старшыні КДБ. Перацягнуўшы з сабой яшчэ аднаго чалавека з Памежнага камітэту — Івана Церцеля, які стаў яго намеснікам па эканамічнай бяспецы і барацьбе з карупцыяй.

Званне генерал-маёра Рачкоўскі атрымаў толькі праз пяць месяцаў. Цікава, што ў той самы дзень пагоны палкоўніка мераў і новаспечаны начальнік службы бяспекі прэзідэнта Андрэй Уцюрын.

Узлёт Ігара Рачкоўскага звязваюць з імем Віктара Лукашэнкі. Справа ў тым, што да прызначэння на пасаду галоўнага пагранічніка, Рачкоўскі нейкі час узначальваў Асобную службу актыўных мерапрыемстваў (АСАМ) памежных войскаў, — тую самую, дзе служылі Віктар і Дзмітрый Лукашэнкі. Прыязныя адносіны з сям’ёй кіраўніка дзяржавы ў Рачкоўскага пачаліся менавіта тады.

Аднойчы кіраўнік Памежнага камітэту нават расказаў журналістам пра стасункі з сынамі Лукашэнкі. «Яны і пад дажджом былі, і на марозе. Словам, служылі, як усе. Натуральна, я іх добра ведаю. І адносіны гэтыя падтрымліваюцца і цяпер. Але казаць пра непагодную блізкасць да прэзідэнцкай сям’і тут не даводзіцца. Мы кантактуем у рамках рабочых дачыненняў. Старэйшы сын Лукашэнкі з’яўляецца памочнікам прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы, мы кантактуем. У рамках развіцця спорту мы кантактуем з Дзмітрыем Лукашэнкам. Яшчэ ёсць чуткі, што мой цесць з’яўляецца адным з намеснікаў Віктара Шэймана. Гэта няпраўда. Мой цесць — доктар навук, выкладае ў Акадэміі кіравання пры прэзідэнце, ён эканаміст. Дачыненні да сілавых структураў ён не мае», — аднойчы прызнаўся І.Рачкоўскі.

АСАМ з’яўляецца ці не самым закрытым і невядомым беларускім спецпадраздзяленнем, пра СОБР ці «Алмаз» вядома хоць нешта. Першапачаткова АСАМ стваралася для супрацьдзеяння нелегальнай міграцыі, потым у справы спецпадраздзялення ўвайшла барацьба з эканамічнымі злачынствамі, наркатрафікам, супрацьдзеянне транзітнаму тэрарызму і гандлю людзьмі. Кажуць, што супраць прызначэння Рачкоўскага на пасаду кіраўніка АСАМу выступаў Віктар Шэйман, але ўжо тады меркаванне Віктара Лукашэнкі аказалася мацнейшым.

На пасадзе старшыні Памежнага камітэту Рачкоўскі мадэрнізаваў дзейнасць ведамства і адаптаваў памежныя працэдуры да еўрастандартаў. Сярод іншага, ён асабіста вучыў пагранцоў усміхацца пры кантакце з грамадзянамі.

Ужо сёння большасць сілавых ведамстваў прадстаўляюць людзі з так званага блоку Віктара Лукашэнкі. Асобна стаяць толькі міністр абароны Мальцаў і генеральны пракурор Васілевіч. Рачкоўскі ж, відавочна, належыць да людзей Віктара. Вось толькі пасада кіраўніка МУС куды больш значная і ўплывовая за месца старшыні Памежнага камітэту.

Прызначэнне Рачкоўскага міністрам унутраных справаў можа быць матываванае патрэбай спыніць барацьбу між МУС і КДБ. Падчас нядаўняй сустрэчы з Зайцавым Лукашэнка адзначыў, што яму надакучылі звесткі ў СМІ пра супрацьстаянне двух ведамстваў. Ну ўжо ж Рачкоўскі і Зайцаў неяк між сабой дамовяцца.

**Зміцер Панкавец**

**Ігар Рачкоўскі**

нарадзіўся ў Смаргоні ў 1968. Скончыў Рыжскае вайскова–палітычнае вучылішча (1990), Інстытут нацыянальнай бяспекі РБ (1996), Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт па спецыяльнасці правазнаўства (2001). Генерал–маёр. Службу праходзіў у вайсковай контравыведцы КДБ і Асобнай службе актыўных мерапрыемстваў (АСАМ) памежных войскаў РБ. Старшыня федэрацыі парусанага спорту.

# Дык навошта нам тая інтэграцыя?

Працяг са старонкі 1.

Цікава, што напярэдадні, наведваючы Японію, Пуцін заявіў: «Расія не мае намеру больш субсідаваць былыя рэспублікі СССР». Словы сугучныя з тымі, што былі прамоўленыя Пуціным месяц таму, што «крэдытная нагрузка на Беларусь становіцца пагрозлівай».

Лукашэнка на гэта адмоўчвацца не стаў. Наведваючы сваю малую радзіму — шклоўскую вёску Александрыя, — ён заявіў, што расійскі бок «правальвае» дамоўленасці ў рамках саюзнай дзяржавы.

«Прэзідэнты прымаюць рашэнні, а ўрад Расіі правальвае. Усё, пра што мы дамаўляемся, падпісваем на самым высокім узроўні — усё блакуецца, не выконваецца. Калі пачынае блакаваць Расія і не пускаць нас на свой рынак, дык навошта нам гэтая інтэграцыя? Але не я вінаваты ў гэтым. Нас абвінавачваюць, што мы бяром удзел ва «Усходнім партнёрстве», развіваем адносіны з Захадам. А што нам рабіць?» — рытарычна запытваўся Лукашэнка.

Уладзімір Пуцін зрэагаваў на выпады ў панядзелак: «Нашы крэдытныя рэсурсы больш мэтазгодна выкарыстоўваць для закупкі айчыннай сельгастэхнікі», — заявіў кіраўнік расійскага ўраду. Што да трактароў МТЗ, дык іх у Расіі збіраюць 11000 з беларускіх трактаракамплектаў, і, на думку міністра сельскай гаспадаркі Расіі, таго досыць.

На гэта зноў адрэагаваў Сідорскі. Праводзячы 26 мая нараду, ён выпаліў у адрас падначаленых: «Учора міністр сельскай гаспадаркі Расіі сказала: вы ведаеце, мы збіраем 11 тысяч трактароў, таму нам больш нічога не трэба. А тое, што ў нас гадавая праграма расійскага ўраду разлічана на 48 тысяч трактароў — забываецца. Трэба падказаць, таму што фактычна сёння рынкі для прасоўвання беларускай прадукцыі закрытыя».

Бачна па ўсім, што сустрэча Пуціна з беларускім кіраўніцтвам абяцае быць гарачай. Сюды ж накладваецца і даўняе жаданне Расіі набыць беларускія малаказаводы, якія беларускі бок не спяшаецца прадаваць. Сюды ж можна дадаць упартае нежаданне Беларусі прызнаваць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Нядаўна абурэнне з гэтай нагоды выказваў спікер Дзярждумы Расіі Барыс Грызлоў.

Звяртае ўвагу, што з гаспадарчых спрэчак Лукашэнка ўсё часцей пераходзіць да пастаноўкі пад сумнеў самой патрэбы інтэграцыі з «братнім народам», якая яшчэ нядаўна была святарнай каровай. Зрэшты, нават перад апошняй сустрэчай з Мядзведзевым Лукашэнка заяўляў, што годзе поўзаць у расійскія кабінеты на каленях, а ўжо праз некалькі дзён мяняў танальнасць і гаварыў, што нашым краінам наканавана жыць разам.

**ЗП**

**Антырасійская рыторыка на БТ**

Штотыднёвая нядзельная аналітычная перадача на БТ «Панарама тыдня» была поўная антырасійскай рыторыкі. Журналіст Юры Пракопаў абвінавачваў усходнюю суседку ў невыкананні дамоўленасцей, а таксама абураўся суцэльна чорным колерам, якімі апісваецца сітуацыя ў Беларусі ў расійскіх СМІ. Нас малююць нахлебнікамі, але яшчэ хто ў каго нахлебнік? — грымеў ён.

# Крызісам па лідэрах

20 найбуйнейшых прадпрыемстваў забяспечылі 30% усіх падатковых паступленняў у бюджэт у 2008 г. Іх унёсак роўны 3,6 млрд даляраў. Ад таго, колькі грошай прадпрыемствы аддадуць дзяржаве сёлета, залежыць фінансаванне бюджэту. Наколькі змяніўся стан лідэраў беларускай эканомікі за год?

### 1. «Беларуськалій»

Флагман эканомікі атрымаў адчувальны ўдар. Прадукцыя прадпрыемства арыентаваная на экспарт, а ён лёг. За студзень-красавік «Беларуськалій» прадаў за межы Беларусі 546,8 тыс. тон калійных угнаенняў. У 2008 за такі ж перыяд прадалося ў 4 разы больш — 2220,6 тыс. тон.

У свеце зменшыўся попыт на ўгнаенні, зменшыліся і кошты — у параўнанні з дакрызісным перыядам на 50—70%, — але Лукашэнка не дазваляе аддаваць танней. «Лепш не вырабляць угнаенні, чым танна іх прадаваць», — заявіў ён.

### 2. «Нафтан», 3. «Мазырскі НПЗ», 4. «Белтрансгаз», 5. «Лукойл-Беларусь» 9. «Беларуснафта», 10. «Юніс Ойл», 12. «Слаўнафта»

Прадпрыемствы, звязаныя з транзітам і перапрацоўкай нафты і газу, адчулі крызіс найраней. Цэны на сусветным рынку патроху растуць, яны пачынаюць разумець, чаго чакаць ад будучыні: зніжэння экспарту і захавання продажаў унутры дзяржавы. Унёсак у бюджэт таксама зменшыцца.

Чаканне інвестыцый у прадпрыемствы звязвалася з магчымым продажам заводаў замежнікам. Але гучных пагадненняў не было. Прадавацт «Мазырскі НПЗ» Беларусь адмовіліся, хоць прапановы і былі. Статус «Белтрансгазу» ўсё той самы: між Беларуссю і Расіяй.

### 6. РУП «Беларускі металургічны завод»

У склад прадпрыемства ўваходзяць заводы ў Жлобіне, Магілёве, Рэчыцы і Оршы. Параўнанне статыстыкі дзейнасці металургічнага гіганту з леташняй пакідае дваістыя ўражанні. З аднаго боку, аб'ёмы вытворчасці нават павялічыліся: напрыклад, сталі выраблена на 4% больш, стальнога пракату — на 5,5%. Прадпрыемства працуе поўны тыдзень і не адпраўляе работнікаў у вымушаны адпачынак.

Але што датычна экспарту — тут справа «швах». Прыбытак у параўнанні са студзенем-красавіком 2008 скараціўся ажно на 49,6%, склаўшы $284,763 млн.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Беларуськалій» пакуль застаецца флагманам беларускай эканомікі.**

### 7. «Мінск-Крышталь»

Найбуйнейшы вытворца алкагольных вырабаў у Беларусі арыентуецца, у першую чаргу, на айчынны рынак. Памеры экспарту ўсёй беларускай высакаградуснай прадукцыі ў 2008 — $12 млн. А ў Беларусі тавар разлятаецца «на ўра». Спаду няма, больш за тое, выракляецца ўсё больш і больш.

$512 мільёнаў — на такую суму было прададзена алкагольных напояў у Беларусі за першыя чатыры месяцы году. Трэба яшчэ ўлічваць, што на айчынным рынку доля «Крышталю» складае больш за 40%. Можна не сумнявацца, што завод як падаткаплатнік не падмане чаканняў дзяржавы.

### 8. «Мінскэнерга», 11. «Гомельэнерга»

Энергетычным прадпрыемствам нічога не пагражае. Яны не арыентаваныя на экспарт, а спажывец электрычнасці ўнутры краіны будзе заўсёды.

### 13. «Вэлком», 14. МТС

У аператараў мабільнай сувязі ўсё ў парадку. Выручка МТС за першы квартал узрасла на 19,8% і склала 262 млрд рублёў (амаль 100 мільёнаў даляраў). Выручка ў «Вэлкома» меншая, каля 20 мільёнаў даляраў, але праца таксама ідзе «ў плюс».

Пасля дэвальвацыі беларускага рубля аператары заявілі, што атрымалі вялікую шкоду і ўзнялі свае тарыфы на 20%. Пасля таго як прэм'ер-міністр Сідорскі запатрабаваў вярнуць цэны, МТС адгукнулася на просьбу ўраду (каб праз месяц ізноў іх павялічыць), а вось Вэлком не звярнуў на яе ўвагу.

### 15. Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман»

Тут не найлепшыя часы. За студзень-люты 2009 рэалізацыя цыгарэтаў скарацілася на 25% у параўнанні з леташнім. Планавы рамонт фабрыкі быў прызначаны кіраўніцтвам на травень. Як паведамілі карэспандэнту «НН» на прадпрыемстве, «рамонт ужо даўно скончаны, «Нёман» працуе ў штатным рэжыме». Склады з прадукцыяй перапоўненыя: на 1 красавіка запасы складалі каля 2 млрд цыгарэтаў (200% да сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці).

Такім чынам, крызіс наймацней ударыў па прадпрыемствах, арыентаваных на экспарт. Тыя, хто гандлюе ўнутры краіны, сутыкнуліся з меншымі цяжкасцямі. Можна чакаць, што адбудуцца змены ў самым версе спісу лідэраў. Пазіцыі «Беларуськалія» ўжо не выглядаюць непарушнымі.

**Ягор Марціновіч**

# Амбітны план Абамы

**які пераверне свет. У выпадку прыняцця закону, ужо ў 2016 годзе кожны аўтамабіль на 100 км будзе расходаваць у сярэднім 6,5 літраў паліва меней.**



**У Беларусі аўто амерыканскага тыпу глядзяцца экзатычна.**

Адміністрацыя Абамы абвясціла план павышэння эканамічнасці аўтамабіляў на 40%. Адзін з галоўных пунктаў плану — абмежаванне расходу паліва легкавікамі прыкладна да 6,6 л на 100 км. Мы, еўрапейцы, ездзім на малалітражных аўтамабілях, тады як амерыканская глыбінка масава ездзіць на хамерах, джыпах і гіганцкіх пікапах, якія жаруць па 11—12 літраў паліва на 100 км. Дзеля выпраўлення сітуацыі будуць масава ўводзіцца рухавікі новых, даражэйшых тыпаў.

Гэта выкліча рост цаны аўтамабіляў і прывядзе да зніжэння продажаў вялікіх машынаў, так папулярных ў Амерыцы. Пікапаў кшталту Chevrolet Silverado і Dodge Ram, а таксама мінівэнаў-вялікасямейнікаў тыпу Chrysler minivan і Chevrolet Traverse пачнуць выпускаць менш.

Мэта новага плану — зменшыць спажыванне паліва Штатамі. На сёння ЗША імпартуе вялізную долю спажыванай нафты, што зводзіць у мінус замежнагандлёвы баланс і дае вялізныя капіталы ў рукі аўтарытарных рэжымаў нафтаздабываючых краінаў.

Мэта нумар два — зменшыць выкіды шкодных рэчываў у атмасферу.

Амбітны план Абамы, напэўна, сутыкнецца з супрацівам як з боку простых амерыканцаў, у якіх любоў да крутых тачак у крыві, так і з боку аўтамабільнага лобі. Уратаванне ледзь жывых гігантаў аўтаіндустрыі, канцэрнаў «Крайслер» і «Джэнерал мотарз», залежыць ад продажаў.

Калі Абаму ўдасца правесці план праз Кангрэс, увядзенне новых нормаў выкліча рэвалюцыю ў аўтамабілебудаванні. У выпадку прыняцця закону, ужо ў 2016 г. кожны амерыканскі аўтамабіль на 100 км будзе расходаваць у сярэднім на 6,5 літраў паліва меней проці цяперашняга ўзроўню.

Зніжэнне залежнасці ЗША ад імпарту паліва было адным з асноўных пунктаў выбарчай праграмы Абамы.

Новы план абыдзецца амерыканскім падаткаплатнікам нятанна. Дзеля яго рэалізацыі Мінэнергетыкі ЗША мае вылучыць $25 млрд дзяржаўных гарантый. Яшчэ $50 млрд будзе каштаваць Закон аб абароне клімату. Цана легкавіка вырасце ў сярэднім на $1300, аднак з часам эканомія на бензіне мае кампенсаваць траты.

Калі такія нормы ўвядуцца ў ЗША, следам на іх пяройдзе і рэшта свету.

**Мікола Бугай**

## Нямеччына: Вялікая дэпрэсія

**У ЗША эканамічны крызіс развіваецца не па найгоршым сцэнары, але ёсць краіны, дзе справы не кепскія, а зусім дрэнныя.**

ВУП Нямеччыны ў першым квартале гэтага году знізіўся на 14,4% проці ўзроўню 2008 г. Гэта нават горш, чым у Расіі, дзе падзенне гаспадаркі дасягнула 9,5%.

Цяжкія часы перажывае і Японія, залежная ад экспарту і імпарту. Там ВУП знізіўся на 15,2%. Да краін-рэкардсменаў далучылася Мексіка — мінус 21,5% у першым квартале. На падтрымку гаспадаркі краіны МВФ вылучыў $47 млрд.

У рытме нямецкай скарачаюцца гаспадаркі Балтыі і Украіны.

Калі тэмпы падзення захаваюцца да канца году, гэта будзе азначаць для многіх краінаў свету паўтарэнне сцэнару Вялікай дэпрэсіі пачатку 1930-х. Нагадаем, тады яно спрычынілася да спаўзання СССР, Нямеччыны, Іспаніі ды меншых краінаў у стан крывавага тэрору.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Феномен у абменніках

Курс продажу валюты амаль зраўняўся з курсам куплі. Гэта вынік заўважнага дэфіцыту валюты ў краіне. Такім чынам банкі заахвочваюць людзей здаваць даляры. 26 мая попыт на даляры на Міжбанкаўскай валютна-фондавай біржы перавысіў прапанову ў чатыры разы.

### Беларусь захоўвае расійскі рынак збыту

Адмоўнае сальда гандлю з Расіяй у першым квартале паменшылася ў 1,5 разоў ў параўнанні з мінулым годам за кошт гандлю прамежкавымі таварамі (68% у структуры экспарту). Тэмпы падзення экспарту ў Расію меншыя, чым у Еўропу.

### Непачэснае лідэрства

Беларусь заняла другое месца сярод краін Еўропы па тэмпах інфляцыі ў студзені-красавіку 2009 году, саступіўшы лідэрства Украіне, сведчаць дадзеныя агенцтва Eurostat і нацыянальных статыстычных служб. За чатыры месяцы з пачатку года рост цэн ў Беларусі склаў 6,5%, ва Украіне — 6,9%, у Расіі — 6,2%. У краінах ЕС спажывецкія цэны ў студзені-красавіку ў сярэднім выраслі на 0,6%.

### Расія хоча скупіць беларускія малаказаводы

Першая намесніца міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Надзея Каткавец заявіла, што расійскі бок накіраваў спіс з 12-ці беларускіх прадпрыемстваў, на якіх хацеў бы атрымаць долю ва ўласнасці. «Мы разглядаем магчымасць, каб Расія прыходзіла сюды з інвестыцыямі, усталёўвала абсталяванне і вырабляла ў нас прадукцыю», — заявіла Надзея Каткавец.

**МБ; Afn.by**

# Няміга: вінаватыя былі

## але ніхто не быў пакараны. 10 гадоў таму, 30 мая 1999 году, у цісканіне ў пераходзе да метро «Няміга» загінулі 53 чалавекі.

На беразе Свіслачы ля праспекту Машэрава адбывалася Свята піва. Грымела музыка, моладзь танцавала. Хмяльны напой разлівалі задарма за 10 накрывак ад цыгарэтаў «Магна». На дурняк сабралася каля 2500 чалавек. Чарга да дармовых бочак стаяла на тры гадзіны. Раптам павеяў парывісты вецер і з-за навакольных небасягаў насунулася шызая хмара. Сыпануў краплісты майскі дождж, грымнула маланка. Хаваючыся ад навальніцы, шматтысячны тлум з канцэртнай пляцоўкі рынуўся ў вузкі падзямельны пераход, пракапаны на месцы летапіснае ракі.

Пярэднія паслізнуліся на мокрым граніце прыступак, задняя з лямантам валіліся на пярэдніх. Хлопцы з гогатам ціснулі дзевак, тыя віскаталі. Ззаду падпіралі новыя сотні распараных спёкай і півам людзей. Ланцужок міліцыянтаў быў проста змецены натоўпам. У бетоннай пашчы згрувасціўся цэлы штабель целаў, няйначай у расстрэльным рове. Віскат змяніўся здушанымі енкамі. Стала не да лашчункаў. Каторыя памяркоўнейшыя, хлопцы зразумелі, што ўтвараецца непапраўнае. «Яны крычалі «назад, назад, назад»...», як спявае рэпер Памідораў. Аднак было позна. Супрацоўнікам міліцыі ўдалося толькі адсячы хвост натоўпу. Чалавек са здушанай дыяфрагмай вытрымлівае хіба хвіліну, а куламесу целаў было не расцягчы.

У цісканіне задушыліся 53 чалавекі, большасць з якіх былі маладыя дзяўчаткі да 20 гадоў. 263 асобы атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

Асноўнымі прычынамі смерці следства назвала ўдушша ад наслаення паваленых целаў, а таксама траўмы ад абцасаў.

У цісканіне загінулі і два міліцыянты. Гэта супрацоўнік мінскага АМАПу Уладзімір Говен і супрацоўнік крымінальнага вышуку сталіцы Генадзь Рабаконь.

### $250 за памерлага

Ахвяраў пахавалі за кошт дзяржавы, родныя атрымалі кампенсацыю — $250 за памерлага і $66 за параненага. Родным выдзелілі льготы — бясплатны праезд, лекі, камунальныя паслугі, але праз два гады Лукашэнка іх адмяніў. На саракавы дзень пасля трагедыі на ўваходзе на станцыю метро ўсталявалі мемарыяльны знак у выглядзе 53 руж, раскіданых па метафарычных прыступках.

У грамадстве віравалі самыя розныя здагадкі наконт таго, што стала прычынай масавай гібелі людзей. Гаварылася пра маланку, якая ўдарыла ў натоўп, пра невядомых маладых людзей у чорнай вопратцы, якія справакавалі цісканіну на прыступках метро. Прагучаў і рэлігійны матыў — свята піва прыпала на Тройцу.

### Справа № 110217

**Ліцыя на Нямізе**

**У суботу 30 мая ад 8 да 9 раніцы да помніку на ўваходзе ў станцыю метро «Няміга» прыйдуць родныя і блізкія, сябры загінулых у цісканіне, каб ускласці кветкі ды запаліць знічкі. Затым у Свята-Духавым саборы адбудзецца памінальная служба. Пасля службы каля помніку пройдзе ліцыя. Чакаецца, што ў ёй возьме ўдзел Мітрапаліт Філарэт.**

Следства, якім кіраваў следчы Генпракуратуры па асабліва важных справах Камароўскі, прааналізавала дзеянні гарадскіх уладаў, якія дазволілі правядзенне мерапрыемства, арганізатараў, міліцыі. У часе допытаў Васіль Гурын, намеснік старшыні гарвыканкаму па сацыяльна-культурных пытаннях, адказаў, што каля Палацу спорту ладзіліся і больш масавыя мерапрыемствы, але да апошняга ўсё абыходзілася.

На мерапрыемства было завезена аж 5100 літраў піва. Гэта пры тым, што на свяце прысутнічалі каля 2500 чалавек. Напой аплаціла, дарэчы, нідзе не зарэгістраваная фірма «Антадэг». Увогуле ж, за святам стаялі багатыя сталічныя бровары.

У выніку расследавання да адказнасці былі прыцягнутыя толькі начальнік грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкаму Віктар Русак і начальнік аддзелу масавых мерапрыемстваў міліцыі грамадскай бяспекі Міхаіл Кандрацін. Іх абвінавацілі ў нядбайнасці (арт. 168 КК, прадугледжвае да 3 гадоў зняволення).

Русаку закідалася, што ён зацвердзіў прадстаўлены Кандраціным план забеспячэння парадку на піўным свяце. У тым плане, сярод іншага, адсутнічалі звесткі пра чаканую колькасць удзельнікаў і гасцей свята, не прадугледжвалася медыцынскае забеспячэнне, адсутнічала схема кіравання і сувязі, а таксама не быў вызначаны парадак арганізаванага выхаду ўдзельнікаў мерапрыемства пасля яго заканчэння. У тым ліку парадак іх эвакуацыі ў выпадку неабходнасці.

Паводле следства, В.Русак загадаў перакрыць выхады на праезную частку, але пакінуў адкрытым уваход на станцыю метро. Як засведчыла судова-псіхалагічная экспертыза, асаблівасці мясцовасці, блізкасць метро і дзеянні міліцыі амаль не пакінулі натоўпу іншага ўкрыцця ад стыхіі, акрамя падземнага пераходу. Людзі натуральна кінуліся ў адзіны адкрыты праход, які да таго ж быў адзіным дахам.

Аднак крымінальная справа № 110217 разглядалася марудна, і ўрэшце 25 сакавіка 2002 году суд Цэнтральнага раёну пастанавіў спыніць яе з прычыны заканчэння тэрміну даўнасці. Міліцыянтаў, якія так і не прызналі сваёй віны (як і ўсе астатнія фігуранты справы — гарадскія ўлады, арганізатары свята), выратаваў прыняты ў новай рэдакцыі ў 2001 годзе Крымінальны кодэкс. Паводле яго, дзеянні абвінавачаных сталі кваліфікавацца як злачынствы, што не нясе значнай грамадскай небяспекі...

### Дзе таямніца, там і плёткі

Пазней у прэсе з’явіцца багата расказаў удзельнікаў святкавання, якія сведчылі не на карысць міліцыі.

Адзін з мінскіх фатографаў паведаміў журналістам, што замест таго, каб аказваць дапамогу пацярпелым, супрацоўнік АМАПу збіў яго і разбіў фотаапарат, папярэдне выцягнуўшы з яго стужку. Фатограф сцвярджаў, што перад тым ён паспеў сфатаграфаваць марадзёраў, якія здымалі з непрытомных людзей упрыгожанні, трупы загінулых.

**Як сябе паводзіць у натоўпе**

**Найлепш абысці яго бокам, але калі вы туды патрапілі, то трэба трымацца далей ад цэнтру і краёў натоўпу. Па магчымасці трэба ўхіляцца ўсяго нерухомага на шляху, не чапляцца рукамі. Ні ў якім разе нельга спрабаваць ісці насустрач натоўпу, нахіляцца за рэчамі, калі яны выпалі з рук. Намагайцеся ўтрымацца на нагах. Калі ж упалі, то трэба абараніць галаву рукамі і намагчыся ўстаць. Пры гэтым трэба падціснуць ногі пад сябе, згрупавацца і паспрабаваць ускочыць рыўком. З каленяў у натоўпе ўстаць цяжэй. Калі вас заціснулі, паспрабуйце абараніць дыяфрагму счэпленымі на грудзях ў замок рукамі. Спіну бараніце локцямі, дыяфрагму — напружваннем рук.**

У той вечар шмат хто з журналістаў, найперш здымачныя групы тэлеканалаў, а таксама фотакарэспандэнты сутыкнуліся з праследам з боку міліцыянтаў. З аднаго боку, іх можна было зразумець — стан афекту, столькі ахвяраў. З другога боку, шакаваныя людзі наракалі, што многія міліцыянты разгубіліся, толькі назіралі за падзеямі, а не дапамагалі людзям. Пісалі газеты і пра тое, што адзін высокі начальнік АМАПу ў той вечар сам знаходзіўся ў «алкагольна-ўзбуджаным стане».

Трагедыя выявіла і нізкую прафесійную падрыхтоўку многіх спецназаўцаў. Характэрны прыклад захоўваецца сярод матэрыялаў следства: «Я зайшоў за ланцужок (маецца на ўвазе ачапленне на верхняй пляцоўцы ўваходу ў пераход на станцыю метро — НН) і ўбачыў на пляцоўцы хлопца з сінім тварам. Супрацоўнік АМАПу рабіў яму штучнае дыханне. Нехта з жанчынаў крыкнуў, што яму трэба высунуць язык. Я гэта зрабіў, і хлопец расплюшчыў вочы, задыхаў» (з пратаколу допыту намесніка начальніка Цэнтральнага РАУС Аляксандра Пархомчыка).

### Бацькі хочуць ведаць

Родныя і блізкія ахвяраў Нямігі арганізаваліся з першых дзён трагедыі. Разам дабіваліся ўсталявання мемарыялу на месцы трагедыі. Выйшла кніга «Трагедыя на Нямізе», працуе сайт. Неўзабаве пасля здарэння было зарэгістраванае грамадскае аб’яднанне «Цэнтр сацыяльнай дапамогі Няміга’99», якім кіруе Наталля Навакоўская, 16-гадовая дачка якой Аляўціна загінула ў праклятым пераходзе.

Родныя ахвяраў цісканіны дагэтуль збіраюцца. Чарговая сустрэча адбудзецца 30 траўня. Яны дагэтуль хочуць, каб былі названыя вінаватыя.

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Месца трагедыі. Праз 10 гадоў.

## Сястра 22-гадовай Ганны Брэчкі: Гэта перамога жыцця над смерцю

У 27-гадовай **Ксеніі Брэчкі** 30 траўня 1999 году загінула 22-гадовая сястра **Ганна**. Яна зварыла суп на ўсю сям’ю і пайшла на канцэрт. Той суп пасля з’елі далакопы...

**«НН»: Побач з мемарыялам на Нямізе можна пабачыць маладзёнаў з півам. Яны смяюцца, размаўляюць па тэлефонах і, здаецца, зусім не звяртаюць увагу на тое, у якім месцы бавяць час. Ці гэта нармальна, па-Вашаму?**

**КБ:** Моладзь з півам ды галубы — гэта лёс усіх помнікаў ды мемарыялаў. Гэта перамога жыцця над смерцю. Калі іх паводзіны не выходзяць за межы агульнапрынятых нормаў — то чаму б ім і не размаўляць па тэлефоне ці прызначаць спатканні менавіта там? Тое, што адчуваю я асабіста, калі праходжу праз гэты пераход, не абавязаныя адчуваць іншыя. Мне балюча, але было б эгаістычна жадаць такога іншым.

Мы ўсе, калі задумацца, вінаватыя ў той трагедыі... Як можна чакаць, што нехта змоўкне каля прыступак «Нямігі», калі норма — ладзіць вясельныя паломніцтвы на Востраў Слёз, помнік ахвярам афганскай вайны? Магчыма, калі праводзіць у школах хаця б адзін урок, прысвечаны не канкрэтнаму выпадку на Нямізе, а проста паводзінам у натоўпе, то сітуацыя змянілася б да лепшага. Каб людзі не пракладвалі сабе шлях лакцямі, не дыхалі адзін аднаму ў патыліцу. Каб паважалі асабістую прастору іншых.

**Падобныя трагічныя выпадкі ў метро**

**14 лістапада 1987 у лонданскай падземцы пасажыры адчулі пах дыму. На пероне станцыі Кінг-Крос усчалася паніка, людзі кінуліся да выхаду. У цісканіне загінула 37 чалавек.**

**28 кастрычніка 1995 у метро сталіцы Азербайджану Баку загарэўся адзін з вагонаў цягніку. Загінула 289 чалавек, у тым ліку 28 дзяцей. Большасць ахвяраў памерлі ў цісканіне.**

# Першы адзіны — Статкевіч

Апазіцыя вызначаецца, хто будзе кідаць пальчатку Лукашэнку ў 2010 годзе.

Чым бліжэйшыя прэзідэнцкія выбары, тым болей унутры апазіцыі размоваў пра Кангрэсы. Мікола Статкевіч гатовы правесці свой Кангрэс праеўрапейскіх сілаў ужо 21 чэрвеня, Аляксандр Мілінкевіч — у кастрычніку. Анатоль Лябедзька заклікае правесці адзіны Кангрэс дэмакратычных сілаў.

Кангрэс праеўрапейскіх сілаў пачаў рыхтавацца яшчэ ў лютым. Большасць суб'ектаў дэмакратычнай апазіцыі, апроч камуністаў і сацыял-дэмакратаў Ляўковіча, утварыла камісію, якая штоцвер збіралася на Сядзібе БНФ.

Ініцыятарам Кангрэсу былі былы палітвязень Мікола Статкевіч.

Супярэчнасці пры падрыхтоўцы былі. Адны выступалі за вылучэнне на Кангрэсе адзінага кандыдата ад праеўрапейскіх сілаў. Іншыя прапанавалі сціплейшы парадак дня.

Тыдзень таму з'явілася інфармацыя, што лідэр Руху за Свабоду Аляксандр Мілінкевіч узяў у свае рукі ініцыятыву. Стала вядома, што рэгіянальным актывістам пайшлі лісты ад яго імя з заклікам узяць удзел у Кангрэсе.

Пасля гэтага актывізаваўся Статкевіч. 21 мая было абвешчана, што ён і яго хаўруснікі склікаюць Кангрэс 21 чэрвеня, роўна праз месяц. Лідэр даўно незарэгістраванай «Народнай грамады» расказаў, што ніякіх сходаў па вылучэнні кандыдатаў у рэгіёнах не будзе. Кожная партыя прывядзе столькі людзей, колькі зможа. А гэтыя людзі і вызначаць адзінага кандыдата. Ці не будзе толькі пры такім раскладзе сярод удзельнікаў Кангрэсу выпадковых людзей?

«Мы кансультаваліся тры месяцы. Па асноўных пунктах ёсць дамоўленасць сямі з васьмі суб'ектаў, якія рыхтуюць Кангрэс», — сказаў М.Статкевіч.

Рух за Свабоду адразу адмовіўся браць удзел у такім мерапрыемстве. Мілінкевічаўцы запэўнілі, што правядуць сваё ў кастрычніку.

Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП) і Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), самыя масавыя сілы, што могуць узяць удзел у Кангрэсе, на заклік Статкевіча таксама не адгукнуліся.

БХД падтрымала Мілінкевіча, а лідэр АГП Анатоль Лябедзька прапанаваў правесці ўвосень аб'яднаўчы Кангрэс дэмакратычных сілаў.

Аб арыентацыі на Мілінкевіча заявіў Уладзімір Навасяд. Неўзабаве і лідэры Маладога Фронту падпісалі дэкларацыю пра адзінства дзеянняў з Севярынцам і маладым крылом Руху за Свабоду.

Ідэя вылучыць адзіным кандыдатам ад апазіцыі Міколу Статкевіча належыць лідэрам Партыі БНФ Вінцуку Вячорку, Лявону Баршчэўскаму і Віктару Івашкевічу, але значная частка актыву іх партыі да гэтага ставіцца скептычна.

Так што ініцыятыва вылучэння адзіным кандыдатам Міколы Статкевіча мае шанцы праваліцца.

**Зміцер Панкавец**

# Віталь Рымашэўскі: Не думайце, што я тэхнічны кандыдат

Канферэнцыя незарэгістраванай Беларускай хрысціянскай дэмакратыі вызначылася з кандыдатам на пасаду прэзідэнта на выбарах–2010. Ім стаў адзін з сустаршыняў партыі **Віталь Рымашэўскі**.

**«Наша Ніва»: Большасць палітыкаў яшчэ не спяшаюцца выяўляць прэзідэнцкія амбіцыі. Ці не фальстарт у вас выйшаў?**

**Віталь Рымашэўскі:** Не, мы дзейнічаем своечасова. Сёння ўнутры апазіцыі сварацца: АДС абвінавачвае ў нечым Мілінкевіча, Мілінкевіч — АДС. Спрэчкі ідуць не ў самых прынцыповых пытаннях. Мы бярэм на сябе ініцыятыву па вызначэнні адзінага кандыдата ад правацэнтрысцкіх сілаў. Выбарцы павінны загадзя ведаць людзей, за якіх будуць аддаваць свае галасы.

**«НН»: Чакалі, што станеце кандыдатам?**

**ВР:** Чакаў. Няпроста далося рашэнне аб вылучэнні. Чаму адважыўся? Бо маю досвед перамоваў з іншымі палітыкамі, арганізацыямі, партнёрамі. Гэтыя мае веды спатрэбяцца.

**«НН»: Шмат хто кажа, што кандыдат ад БХД на выбарах будзе проста тэхнічным.**

**ВР:** Я прасіў аднапартыйцаў галасаваць за мяне з адзінай умовай: прадстаўнік БХД можа стаць адзіным дэмакратычным кандыдатам і правесці паўнавартасную кампанію.

**«НН»: Людскога і фінансавага рэсурсу ў БХД хопіць, каб выцягнуць цэлыя выбары?**

**ВР:** Людскога рэсурсу ў БХД больш, чым у іншых. З фінансамі на сёння яшчэ пытанне адкрытае, але ёсць час нешта выправіць.

**«НН»: Хто вашы галоўныя хаўруснікі?**

**ВР:** Па-ранейшаму, БНФ. Спадзяюся, што ўнутраныя праблемы, якія існуюць у партыі, будуць вырашаныя. Таксама Рух за Свабоду, «Малады фронт», «Маладая Беларусь».

**«НН»: Шанец перамагчы ў 2010-м ёсць?**

**ВР:** Ёсць. Усё будзе залежыць ад падрыхтоўкі выбараў. Галоўнае — спыніць усе сваркі ўнутры апазіцыі.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Віталь Рымашэўскі**
нар. у 1975 у Бабруйску. Закончыў Нацыянальны тэхнічны універсітэт па спецыяльнасці «Інжынер–будаўнік». Быў сябрам АГП, намеснікам старшыні яе мінскай гарадской арганізацыі. Заснавальнік БХД у 2006. Быў індывідуальным прадпрымальнікам. Цяпер вядучы эканаміст кампаніі «Беларусь капітал менеджмент» (Расія). Жанаты, чакаюць дзіця.

КАМЕНТАР

# «Бомба» для Мілінкевіча

Піша **Аляксандр Старыкевіч**.

На палітычным фронце — нечаканае абвастрэнне. Здаецца, разгортваецца сур'ёзная інфармацыйная атака на лідэра Руху за Свабоду Аляксандра Мілінкевіча. Пры гэтым яго апаненты, мякка кажучы, не саромеюцца ў выбары сродкаў.

У сакавіку на малавядомым сайце з'явіўся артыкул Міхаіла Падаляка «Адбельвальнік «М.», прысвечаны «падступнай місіі» А.Мілінкевіча. Нягледзячы на «грандыёзнае выкрыццё», рэзананс быў зусім нязначным.

Наўрад ці гэтая публікацыя была вартая згадкі, калі б яе — праз два месяцы! — не перадрукавала «Народная воля».

М.Падаляк даўно спецыялізуецца на канспіралагічных тэорыях. Праўда, яны рэдка знаходзяць пацвярджэнне ў рэчаіснасці.

Вось першы-лепшы прыклад. Артыкул "Вайна Лукашэнкі" быў напісаны ў красавіку 2006 г. Там ва ўласцівай Падаляку безапеляцыйнай форме выкладзены прагноз, што хутка беларускаму кіраўніку давядзецца шукаць хованкі ў суседняй краіне: «У Расію ў канцы 2007 г. тайным рэйсам спешна прыляціць зусім іншы Лукашэнка. Сапраўдны. З дрыжачымі рукамі, сагнуты, з шырокімі зрэнкамі, з апухлымі павекамі і ціхім заікаючымся голасам...».

Але хто цяпер памятае, што пісаў Падаляк у 2002 ці 2006 г.? Таму ён працягвае распавядаць пра «таемныя спружыны палітыкі» зноўку і зноўку.

У «Адбельвальніку «М.» выкладзеная версія змовы, удзельнікамі якой нібыта з'яўляюцца Лукашэнка, еўрапейскія «зубастыя акулы-пасярэднікі» і Мілінкевіч.

Сабраліся яны разам, каб, на думку Падаляка, забяспечыць «сумленную перамогу» цяперашняга кіраўніка Беларусі на будучых прэзідэнцкіх выбарах.

Усе гэтыя думкі, безумоўна, маюць права на існаванне. Аднак аўтар не спыніўся на здагадках адносна бліжэйшых палітычных перспектываў, а перайшоў да простых абвінавачванняў на адрас кіраўніка Руху за Свабоду. На думку Падаляка, Аляксандр Мілінкевіч на грошы Аляксандра Лукашэнкі арганізоўвае расколы ў партыях і прававаўцы ў грамадскіх арганізацыях, скупляе журналістаў і г.д., і г.д..

Чым падмацаваныя гэтыя сур'ёзныя абвінавачванні? Анічым! Доказаў — нуль! Прыблізна з тым самым поспехам можна было напісаць, што Мілінкевіч — злосны марсіянін, засланы на Зямлю з мэтай захопу нашай планеты. Хай потым апраўдваецца!

Па сутнасці, «Адбельвальнік «М.» нічым не розніцца ад антыапазіцыйных агітак, якімі пічкае сваіх гледачоў БТ. Рэцэпт гэтых «шэдэўраў» вядомы: для надання праўдападобнасці вазьміце каліва агульнавядомых фактаў і змяшайце іх з сваімі фантазіямі. Потым шчодра дадайце бяздоказных абвінавачванняў і ў канцы — «для тупых» — прысуд: «Ату яго, ату!»

«Народная воля» ў рэдакцыйнай прадмове піша, што не мае маральнага права (!) не пазнаёміць чытачоў з «Адбельвальнікам «М.», і спадзяецца, што артыкул стане пачаткам «сур'ёзнай дыскусіі пра незвычайную сітуацыю».

Але сур'ёзныя дыскусіі не пачынаюцца з вядра памыяў, вылітага на аднаго з меркаваных удзельнікаў дыялогу.

Мілінкевіча ёсць за што крытыкаваць. Самы свежы прыклад — адмова (пад надуманай, з майго гледзішча, прычынай) паставіць свой аўтограф пад зварот да Еўрасаюзу, які падпісалі Івонка Сурвілла, Зянон Пазняк, Станіслаў Шушкевіч і Аляксандр Казулін.

Але галаслоўна абвінавачваць Мілінкевіча ў змове з Лукашэнкам і іншых вышэйпералічаных грахах — гэта, прабачце за выраз, падласць.

Падобныя прыёмы выкарыстоўваюць, калі сапраўдных пераканаўчых аргументаў няма.

...Рызыкну выказаць здагадку, што «Адбельвальнікам «М.» справа не скончыцца. У бліжэйшы час можна чакаць новых «выкрыццяў».

**«Салідарнасць», скарочана**

### Моладзь падтрымала Мілінкевіча

28 моладзевых лідэраў з розных палітычных партый і грамадскіх арганізацый прынялі маніфест аб сваёй супольнай далейшай дзейнасці. Сярод падпісантаў Павал Севярынец, Юрась Губарэвіч, Алесь Міхалевіч, Зміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч, Сяргей Салаш, Алесь Зарамбюк і іншыя. Сустаршыня БХД Павал Севярынец кажа, што ў дэмакратычным руху наспела патрэба ў змене пакаленняў.

У маніфесце адзначаецца, што моладзь падтрымлівае дзеянні лідэра Руху за Свабоду Аляксандра Мілінкевіча па наладжванні адносінаў Беларусі і Еўрасаюзу. «Кампанія, што разгарэлася апошнім часам супраць Мілінкевіча, стала апошняй кропляй для падпісання такога звароту. Некалі мы назіралі, як знішчалі Пазняка. Нельга дапусціць, каб сёння гэта паўтарылася з Мілінкевічам», — сказаў П.Севярынец.

# Чарнасоценны дапаможнік па «белорусской» гісторыі

Піша **Андрэй Павач**.

Ад сталініста да чарнасоценца адзін крок. Гэтая ісціна стала для мяне прапісной, і я не здзіўляюся, калі чую, што чарговы праваслаўны святар побач з абразом пакутніка-цара Міколы II павесіў ікону з выявай Сталіна.

Хуткай і зусім лёгкай аказалася эвалюцыя былых савецкіх гісторыкаў-сталіністаў у бок славянафільства. Чаго не зробіш дзеля захавання дзяржаўнага адзінства трох усходнеславянскіх народаў. Кінешся не тое што ў марксізм-ленінізм, а і ў рэлігійную містыку. Вось, пачытайце, калі ласка: «Усходнеславянскія народы працягваюць захоўваць структуру своеасаблівага этнічнага саюзу — Рускага свету, трыліснiку, непадзельнага ў аснове. Разрыў гэтага адзінства быў бы згубным для ўсіх трох частак. Народы гэта разумеюць не толькі на ўзроўні грамадскай свядомасці, але і на ўзроўні падсвядомасці. ...Нягледзячы на ценевыя моманты, існуюць лёсавыя, выратавальныя падзеі. Для Беларусі такой падзеяй стала місія Рускай праваслаўнай царквы».



Гэта цытата з надрукаванага ў 2008 г. дапаможніку для вучняў 10 класу сярэдніх школ пад назвай «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да кастрычніка 1917 г.» (аўтары Я.Трашчанок, А.Вараб'ёў, В.Валжанкоў).

Дапаможнік паступіў у навучальныя ўстановы. Праўда, у некалькіх экзэмплярах, што выглядае на разведку боем — калі настаўніцтва і грамадскасць ніяк не адрэагуюць на «ідэалагічную рэвалюцыю», дапаможнік можа запраста пераўтварыцца ў адзіна правільны і абавязковы. А «змена ідэйных парадыгмаў» (як любяць выказвацца дзяржаўныя чыноўнікі ад навукі) у дапаможніку сапраўды грандыёзная.

Па-першае, выносіцца рашучы прысуд нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі: «нацыянальнымі героямі аказваюцца не толькі старажытныя літоўскія князі-паганцы [кароль Міндоўг, Альгерд Заваёўнік — тут і далей заўв. Рэд.], але і польскія каралі [маецца на ўвазе, напрыклад, Сцяпан Батура, які меў за рэзідэнцыю Гродна і вызваліў Беларусь ад акупацыі войскамі Івана Жахлівага], літоўска-польскія магнаты [напрыклад, Радзівілы, Астроўскія, Сапегі] і шляхецкія мяцежнікі-тэрарысты [Каліноўскі, Грынявіцкі]. Гэтыя гістарычныя трактоўкі, адкрыта перадаваныя з пазіцый рэнегацкай апалячанай шляхты, выдаюцца за сапраўды патрыятычныя, нацыянальна-беларускія».

Уся нацыянальная гісторыя перастаўляецца з ног на галаву. У варыянце Трашчанка дэмакратычныя гурткі беларускіх народнікаў пераўтварыліся ў «беларускія нацыяналістычныя гурткі», К.Каліноўскі стаў «паводле этнічнай ідэнтыфікацыі палякам», які «сеяў у душах нецярпімасць, распальваў тэрор», а ўвесь беларускі рух пачатку XX ст. насіў «вузкасектанцкі, абмежаваны характар» і меў «агрэсіўна-сепаратысцкую накіраванасць».

Затое віленскі генерал-губернатар М.Мураўёў «быў не толькі «вешальнікам», але і таленавітым адміністратарам», а мітрапаліт І.Сямашка «адносіцца да ліку найвыдатнейшых дзеячоў беларускага народу».

Не пазбаўлены падручнік парэштках марксісцка-ленінскай дыялектыкі. Я.Трашчанок, мабыць, аддаючы даніну свайму камуністычнаму мінуламу, піша: «Па іроніі лёсу адзіны геніяльны палітык Расіі, а магчыма, усяго чалавецтва пачатку XX ст. Уладзімір Ульянаў-Ленін аддаў свой выдатны талент не мірнай стабілізацыі, а рэвалюцыйнаму разбурэнню свету».

Канцэпцыя дапаможніку — беларусы маюць своеасаблівую «дуалістычную» свядомасць, адчуваюць сябе адначасова і расійцамі, і беларусамі. Нацыянальны ж рух — звыродлівае, выклікане шкоднымі заходнімі ўплывамі, адхіленне ад спрадвечнага імкнення да трыадзінства народаў.

Наўрад ці каму з чытачоў «НН» спадабаецца такі дыягназ для «нацыянал-сепаратыстаў», хіба толькі нашым актыўным апошнім часам прадстаўнікам «гарлівага» ліцвінства. Бадай, тое самае яны пішуць на сваіх інтэрнэт-блогах. Але радавацца супадзенню іх каталіцка-прапольскай канцэпцыі і трашчанкоўскай чарнасоценна-праваслаўнай ідэалогіі ліцвінам рана, бо гісторыя вуснамі спадара Трашчанка выносіць бязлітасны прысуд таксама і ім. «Ліцвіны» так і засталіся вечнай меншасцю на беларускай зямлі. ...Яны ніколі не адчувалі сябе слугамі народу, заўсёды прэтэндавалі на ролю паноў, у крайнім выпадку — даверанных прыказчыкаў пры панах чужаземных».

Аўтары дапаможніку нават не спрабавалі прыхаваць няведанне гістарычных фактаў. Паводле іх пераканання, яшчэ ў XII ст. полацкаму вечу дапамагала кіраваць таямнічая «рада паноў», а ў 1839 г. уніяты на тэрыторыі Расійскай Імперыі поўнасцю зніклі (хоць аж да 1875 г. пад панаваннем Раманавых знаходзілася вялізарная Холмская грэка-каталіцкая епархія).

Ні ідэалагічныя развагі, ні факталагічныя «адкрыцці» не выклікалі пярэчанняў у рэцэнзентаў дапаможніку, сярод якіх бачым прозвішчы дырэктара Інстытуту гісторыі Акадэміі навук А.Кавалені, і былога в.а. дырэктара гэтай жа высокай акадэмічнай установы М.Сташкевіча. Хто ж рэдагаваў дапаможнік, каб яго маглі чытаць падлеткі, наогул, застаецца таямніцай. Чаго вартыя сустрэтыя ў тэксце паняцці «культурная матрыца», «грамадзянскае грамадства» (у сэнсе грамадзянская супольнасць) ці выраз аб тым, што «Расія была «цяжарная» рэвалюцыяй».

Беларускі настаўнік, змучаны здзекамі разумнікаў з міністэрстваў, папяровай валакітай і мізэрнымі заробкамі, наўрад ці будзе актыўна супрацьдзейнічаць пераробцы нацыянальнай гісторыі. Мы стаім перад спробай яе фальсіфікацыі ў самым агрэсіўным, ужо не «прыгладжаным» савецкім, а класічным імперскім варыянце. Яна пакінула межы зацішных акадэмічных кабінетаў і выбіраецца на шырокія воды школьнага выкладання, скуль праз нейкі час цэлай ракою гразі пальецца ў галовы нашых школьнікаў.

# Не зайздросці!

**Уладыка Філарэт**
**падвёў ідэалагічныя асновы пад паварот да капіталізму.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Прычыны эканамічнага крызісу трэба шукаць у грэшнай прыродзе чалавека, заявіў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, патрыяршы экзарх усяе Беларусі на адкрыцці XV міжнародных Кірыла-Мяфодзеўскіх чытанняў на тэму «Духоўныя асновы сацыяльнай і эканамічнай устойлівасці сучаснага грамадства», а ідэальна справядлівай эканамічнай сістэмы не бывае.

Мітрапаліт сказаў:

— Усякая спроба стварэння дзяржавы бязгрэшных людзей, якая валодае дасканалай эканамічнай сістэмай, будзе ўтопіяй.

Дзейнічаючы ў людзях, грахі заўсёды прымушаюць іх ілгаць і парушаць устаноўленыя імі парадкі, спараджаюць несправядлівасць. Праз надзвычайнае распаўсюджванне такога граху, як зайздрасць, ніякая эканамічная сістэма не будзе справядлівай для ўсіх.

Агульная сацыяльна-эканамічная стабільнасць залежыць ад устойлівасці жыццёвых умоваў простых працаўнікоў, здольных сваёй здаровай прыватнай ініцыятывай не толькі падтрымаць сябе і свае сем'і, але і стварыць працоўныя месцы для сваіх суайчыннікаў. Гаворка ідзе пра заахвочванне асабістай эканамічнай ініцыятывы, пра падтрымку індывідуальных прадпрымальнікаў, пра апору на сярэдні і малы бізнэс.

Праца не богаўгодная, калі яна скіраваная на служэнне эгаістычным і грэшным запатрабаванням асобы.

Чытанні, якія праводзяцца Беларускім экзархатам РПЦ пры падтрымцы шэрагу дзяржструктур і Фонду імя Конрада Адэнаўэра (які належыць Хрысціянска-дэмакратычнай партыі ФРГ), доўжыліся да 24 мая.

**Паводле: Марат Гаравы, БелаПАН**

## ГОЛЫ ФАКТ

### Дайшлі да ручкі



Вядучыя «Нашага утра» на АНТ Лушчык ды Кашчэеў запрасілі ў госці пасла Швецыі. Ён гаварыў з імі па-беларуску, а яны з ім размаўлялі па-расійску.

**Алесь**

## ЦЫТАТЫ

### Дазвольце нам гандляваць толькі беларускім півам

«Мы заклікаем вас, Аляксандр Рыгоравіч, Адміністрацыю прэзідэнта, Савет міністраў і абласныя выканаўчыя камітэты падтрымаць антыкрызісную ініцыятыву РГА «Перспектыва» ў частцы дазволу гандлю півам выключна беларускай вытворчасці ў кіёсках і павільёнах».

Са звароту прадпрымальніцкага РГА «Перспектыва» (на чале з Шумчанкам).

### Еш сваё

А.Лукашэнка, звяртаючыся да беларусаў: «Я хачу, каб вы адзяваліся ў сваё і елі сваё. Можа, яно горш упакаванае, чым імпартнае, але сёння сітуацыя такая, што валюты бракуе».

### Каго вы маеце на ўвазе?

«Выяўленыя факты фармалізму, пратэкцыянізму, сямейнасці, ігнаравання нарматыўна-прававой базы».

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей на нарадзе па кадравых пытаннях.

Працяг са старонкі 1.

# Будаўнік у банку


PHOTO.BYMEDIA.NET

Ён ведаў, што будаўнікам, галоўным лабістам якіх ён быў, конча трэба свабодныя грошы. Таму, Багданкевіч, грошы на бочку. І мы ўдвая больш сена для кароў... цьху, жытла для насельніцтва пабудуем!

Пэўная логіка ў пазіцыі Пракаповіча была. Не банкаўская, а менавіта будаўнічая. Яму трэба было забяспечваць сваіх работнікаў фронтам работ. А Багданкевіч звязаў грашовую масу так, што фронт развярнуць ніяк не выходзіла. І толькі прыход да ўлады Аляксандра Лукашэнкі, які залічыў будаўніцтва да прыярытэтных задачаў сваёй улады (пра «праекты» тады, як і пра Пуціна з Мядзведзевым, ніхто проста не гаварыў), даў магчымасць Пракаповічу нацешыцца, назіраючы за адстаўкай свайго апанента.

Праўда, сам Пётр Пракаповіч да таго часу ўжо шчасліва пакінуў дэпутацтва і перайшоў на працу ў Адміністрацыю прэзідэнта.

### Выканаўчы ва ўладзе

Тут ён быў абсалютна да месца. Задача Адміністрацыі — найперш кантроль за выкананнем прынятых рашэнняў. Пракаповіч быў эканамічным педантам. Ён тупа — няхай даруе гэтае не зусім ветлівае слова — сачыў за тым, каб рашэнні выконваліся. І яны выконваліся. Словы, вымаўленыя прэзідэнтам, даводзіліся да стану справаздачаў пра прынятыя меры. Праўда, у адрозненне ад Сяргея Ткачова, Пракаповіч быў і заставаўся практыкам. І калі ён бачыў, скажам, што яго улюбёнай галіне ў нейкі момант магло стаць горш, канфлікт тэорыі рынкавага сацыялізму і практыкі неасацыялістычнага рынку вырашаўся шляхам перамогі практыкі.

Так ён давёў сваю адданасць і стараннасць. Ім можна было ўзмацняць урад. І ўзмацнілі. Пётр Пракаповіч заняў кабінет першага віцэ-прэм'ера.

Мне расказваў адзін эканамічны журналіст, які, на жаль, потым сышоў з прафесіі, якія плёткі хадзілі пра Пракаповіча ў той перыяд:

— Уяўляеце, выклікае супрацоўнікаў свайго апарату на адным, дзве гадзіны распытвае, чым яны тут займаюцца, усё ў кніжачку запісвае. Потым падручнікамі абкладаецца, чытае іх — ага, і ў кніжачку сваю зазірае. І калі другім разам сустракаецца з падначаленым, то ўжо размаўляе з ім як з роўным па ступені валодання матэрыялам.

Ну, дапусцім, не з другога разу, але з пятага дакладна. Пры віцэ-прэм'ера Пракаповіча раптам загаварылі як пра самага кампетэнтнага чальца беларускага ўраду. Ён літаральна ўгрызаўся ў кожнае пытанне, якое яму даручалі развязаць, вывучаў яго да тонкасцяў. Ён не саромеўся свайго няведання, некампетэнтнасці. Разумеў, мабыць: ніводзін чыноўнік не засмяецца, пачуўшы бязглуздзіцу ад намесніка старшыні ўраду. А другой нагоды для смеху Пётр Пракаповіч яму ўжо не дасць, бо цалкам прыдатным для навучання выявіўся.

Як мядзведзя можна навучыць танчыць, так стараннага чыноўніка можна навучыць адэкватна функцыянаваць на любым месцы. Абы ў яго было шчырае жаданне працаваць добра. А ў спадара Пракаповіча такое жаданне было заўсёды. Вінаватая ўсмешка чалавека ў таўсташкельных акулярах нібы казала суразмоўцу: вы ўжо, пане мой, не хвалюйцеся — нам бы толькі дзень прастаяць ды ноч пратрымацца, а там усё асвоім, дамо рады, адужаем...

### Электрычнае крэсла

Праўда, радавацца ўрадаваму апарату давялося нядоўга. Пракаповіча перакінулі на Нацбанк.

Сітуацыя ў Лукашэнкі была крытычная. Пераспрабаваўшы працаваць з трыма прафесійнымі банкірамі — Багданкевічам, Віннікавай і Алейнікавым, ён нечакана адкрыў для сябе бясспрэчную ісціну: ён іх не разумее. Яны гаварылі на нейкай іншай мове. Нават Віннікава, найбольш лаяльная да былога дырэктара саўгасу «Гарадзец», не магла зрабіцца прасцейшай, чым была. Прафесіяналізм не дазваляў.

Кіраўнік дзяржавы не разумеў іх — а таму баяўся. Ён іх і здымаў з пасады не таму, што ўсе яны так кепска працавалі, а проста не давяраў. Віннікаву і арыштавалі, насамрэч, адспекуляваўшы ў патрэбным ракурсе на той самай ноце недаверу. Пра нелаяльнасць асабістую і палітычную размовы проста ісці не магло.

Не, Лукашэнку на пасадзе старшыні Нацбанку адназначна быў трэба чалавек, якому ён давяраў бы. Разумеў бы ягоную мову. А дзе знайсці такога банкіра? Хіба выгадаваць.

І Пракаповіча выправілі ў банк. Гэта не было высылкай. Гэта было павышэннем і адкрывала перспектывы. Але Пракаповіч спалохаўся. Тэлекамеры паказвалі яго, намагаючыся не акцэнтаваць увагу на тым, што да вінаватасці ў ягоным позірку дамешваўся менавіта спалох.

### У стане бесперапыннага спалоху

Адна справа — крытыкаваць і кантраляваць. Банкаўская праца ў гэтым аспекце мала чым розніцца ад футболу, у які не разбіраецца хіба толькі аўтар гэтага артыкулу. І зусім іншае — калі ты робішся адказным.

Што такое «адказнасць», спадар Пракаповіч ведаў вельмі добра з асноўнай сваёй працы — той, першай, па спецыяльнасці. Разумеў: можна паспяшацца і здаць аб'ект датэрмінова. Можна нават паспрабаваць скрасці матэрыялы і скласці сабе невялікі палац на ўчастку ў пятнаццаць сотак, атрыманым ад бабулі. Аднак калі аб'ект «накрыецца», дык разам з ім «накрыецца» і той, хто яго будаваў. За савецкім часам гэта пільнавалі не менш, чым у бурную лукашэнкаўскую эпоху. А «накрывацца» Пракаповіч не хацеў. І банк ён разглядаў як такі самы «аб'ект» — з усімі наступствамі.

Менавіта таму звышасцярожны Пракаповіч не праводзіў зачысткі банкаўскіх калідораў ад клеркаў, што аселі там яшчэ за Багданкевіцкімі часамі. Наадварот, пачаў зноў залучаць старыя кадры. «Людзі Багданкевіча», у тым ліку і сам ганаровы старшыня АГП, мелі вольны доступ у Нацбанк, і галоўны банкір краіны з увагаю ўслухоўваўся ў іх рэкамендацыі.

І не толькі да Багданкевіча прыслухоўваўся Пракаповіч. Калі ўважліва прааналізаваць расстаноўку ўплывовых персанажаў ва ўласным атачэнні Пракаповіча, убачыш, як старанна «падабраў» і «абагрэў» спадар Пётр тых людзей, якія ў розны час супрацоўнічалі з Міхаілам Мясніковічам. І Павел Калавур, і Мікалай Кадушка, кажуць, звязаныя з Мясніковічам цесна. Кадушка, калі памяць не здраджвае, і памочнікам ягоным у эпоху віцэ-прэм'ерства працаваў. Словам, менавіта Пракаповіч здолеў згуртаваць вакол сябе тыя «прагрэсіўныя кадры», чые парыванні ад світанку лукашэнкаўскай эпохі мусіў «ураўнаважыць» Сяргей Лінг, а на практыцы на доўгія гады «ўраўнаважыў» сам Лукашэнка.

Аказваецца, страх зрабіць штонебудзь не так — не найгоршая якасць для чыноўніка. Галоўнае — разумець, што працаваць жа усё адно трэба, бо за бяздзейнасць на такім участку галаву здымуць.

І Пракаповіч пачаў працаваць. Так, што сёння банкаўскае асяроддзе баіцца ягонай адстаўкі. Бо, па-першае, незразумела, каго прызначаць. А па-другое, у адрозненне ад папярэднікаў, Пракаповіч роўнааддалены ад усіх банкаўскіх кланаў. Вядома, «Беларусбанк» — асаблівы банк. Але ўсе астатнія роўныя. Асабістай зацікаўленасці ў яго ўсё яшчэ няма.

### Герой Беларусі

Пракаповіч здолеў зрабіць немагчымае двойчы. Першае — стаць прафесіяналам у дзяржаве, дзе прафесіяналізм лічыцца за адзін са смяротных грахоў. І другое — прыдбаць абсалютны давер прэзідэнта.

Менавіта яго дзеянні найменш выклікаюць крытыку з боку Аляксандра Лукашэнкі. Ужо першае з'яўленне Пракаповіча ў кадры разам з прэзідэнтам і залатым запасам краіны фактычна прыраўняла Пятра Пятровіча да гэтага самага залатога запасу. Апошняя ж агаворка, калі прэзідэнт публічна назваў галоўнага банкіра краіны старшынёй ураду, амаль пахіснула асновы дзяржаўнага апарату. І не таму, што яна мела месца. А таму, што яе не выразалі з тэлевізійнай трансляцыі. Стала зразумела, што Пракаповіч і сапраўды разглядаецца на гэтае месца. Але, але...

Паводле прагнозаў, менавіта на жнівень мае шанец прыпасці чарговая дэвальвацыя рубля. І тут пытанне ў тым, каго менавіта — інстытуцыйна, а не толькі персанальна — прызначыць Лукашэнка адказным за гэты абвал. Калі Нацбанк — Пракаповічу давядзецца нясмела бліснуць лінзамі шкельцаў і сысці, б'ючы сябе ў грудзі і прамаўляючы «Mea culpa!» А вось калі ўрад, тады Пракаповіч рэальна робіцца кандыдатам нумар два на месца прэм'ера.

Бо кандыдат нумар адзін у Аляксандра Лукашэнкі ўжо ёсць.

**Аляксандр Фядута,**
**спецыяльна для НН**

**Раней у цыкле:**

«Уладзімір Макей. Другі твар» № 14

«Наталля Пяткевіч. Русалка на аблоках» №16

«Юры Жадобін. Генерал мірнага часу» №17

«Сяргей Ткачоў. Чалавек-невідзімка» №18

Наступная публікацыя будзе прысвечаная Уладзіміру Сямашку.

## УСЯГО ПАТРОХУ

### Дэсант Радзівілаў

Нашчадкі Радзівілаў прывезлі ў Беларусь апошнюю прадстаўніцу роду — княгіню Альжбету. Да вайны яна жыла ў Нясвіжы гаспадыняй. Калі ў замку такі закапаныя скарбы магнатаў, то менавіта Альжбета ведае, дзе.. Візіт арганізоўвае журналіст Глеб Лабадзенка. Праграма такая: панядзелак — замак Мірскі і рэзідэнцыя ў Паланечцы. Аўторак — Мінск. Серада — Нясвіж.

### Дзяўчына загінула на плошчы Якуба Коласа

Смяротнае здарэнне адбылося ў панядзелак каля 8-й ранку на праспекце Незалежнасці насупраць філармоніі. 28-гадовая дзяўчына перабягала дарогу па-за пешаходным пераходам. Яе збіў аўтамабіль.

### Да Нью-Ёрку дабраліся

«Ляпіс Трубяцкой» спяваў 24 мая ў Irving Plaza. Падчас канцэрту нью-ёркскія гледачы гукалі «Беларусь! Беларусь!». Музыкі ў адказ выканалі песню «Belarus Freedom» з апошняга альбому «Маніфест». У клубнай зале луналі бел-чырвона-белыя сцягі.

### Другакласнік купіў машыну

У міліцыю звярнулася полацкая сям'я з заявай пра знікненне з кватэры грошай. Высветлілася, што грошы вынес сын пацярпелых, вучань 2-га класа. Грошы яму спатрэбіліся на набыццё машыны (не цацачнай), што і ўдалося яму зрабіць.

### У Рыбака скралі скрыпку

Невядомыя злачынцы пакінулі пераможцу «Еўрабачання» без улюбёнага інструмента. Адбылося гэта непасрэдна пасля прылёту Сашы Рыбака ў Осла.

**МБ**

# Дождж, вясёлка, Bela Music

**Першы фестываль «Bela Music–2009» вытрымаў выпрабаванне кепскім надвор’ем: больш за тысячу гледачоў, не спалохаўшыся дажджу, сабраліся паслухаць беларускую музыку на вольным паветры.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Нягледзячы на чыста нарвежскае надвор’е, у Баравой сабраліся паўтары тысячы гледачоў.**

Першая навала дажджу прыйшлася на заканчэнне выступу «Гарадзкіх». «Хлопцы, плашчык не пазычыце?» — звярнуўся хтосьці са змакрэлых гледачоў да шэрагу захутаных у плашчы-накідкі міліцыянтаў. «Прыходзь да нас служыць, выдадуць», — аджартаваўся адзін з ахоўнікаў парадку. Тым часам яго калегі павялі за тэрыторыю дзвюх нецвярозых дзяўчат — на фэсце было строга з алкаголем, у гукаўзмацняльнік папярэджвалі, што нецвярозых пускаць не будуць. Увогуле, відавочна «разагрэтых» гледачоў амаль не было, і гэта не магло не радаваць.

Каля сцэны сабралася больш за тысячу чалавек. Абяцанае штармавое папярэджанне многіх прымусіла адмовіцца ад паездкі ў Баравую. Сонейка заззяла толькі як на сцэну выйшлі «Дзецідзяцей». Гук быў на ўзроўні, чым карысталіся аматары халявы, якія пазбіраліся за агароджай. Сцэна была аформленая празрыстым экранам і бягучым радком.

«Дзяцей» змянілі дзяды айчыннага року — удзельнік «Песняроў» і «Сузор’я» Аляксандр Растопчын з сваім Rastop power trio.

У баку ад сцэны праз агароджу перамаўляўся з прыхільнікамі свайго таленту Пятро Ялфімаў. «Глядзі, сёння не ў белых штанах» — усміхаліся гледачы. Выхад Ялфімава сустрэлі досыць прыязна, хоць без асобных выгукаў не абышлося. Пасля першай песні над натоўпам з’явіўся саматробны плакат «Спяваеш ах***-на».

Сапраўдныя танцы пачаліся з выхадам Кулінковіча і ягонай банды. З першымі акордамі «Прыйшоў наш час» побач са сцэнай разам з маладымі людзьмі пачала танчыць нават пара сталага веку. Аляксандр Кулінковіч здзейсніў «выхад у народ», чым выклікаў захапленне публікі і прымусіў напружыцца асалавелых ад гуку спецназаўцаў. А з заходняга кірунку тым часам насоўваўся чарговы фронт. «Мы выклікалі віхор!» — выгукнуў Кулінковіч, вызваляючы месца Алегу Хаменку. «Палац» зайграў пад даволі моцны ўжо дождж. Над натоўпам разгарнуліся парасоны. Хаменка папрасіў людзей пацярпець ды прысвяціў песню «Маці» памяці Алега Янкоўскага. Дождж, як ні дзіўна, разняволіў людзей, і пачаліся ўсеагульныя танцы. А падвойная вясёлка, што неўзабаве заззяла над аэрадромам, нават суворых міліцыянтаў прымусіла ўсміхацца з дзіцячай непасрэднасцю. Пра «грукатала кола», і на сцэну выйшлі «Без білета». Частка народу пайшла сагрэцца гарбатай, актывізаваліся фанаты гурта з постэрамі.

Гарбату з астылымі шашлыкамі падавалі цётачкі ў чырвона-зялёных брылях і гэта разам з расейскай мовай з боку сцэны стварала дзіўнаватае адчуванне, што знаходзішся ты на якім чарговым святе горада. Ажно не: вось непадалёк праходзіць аналітык Віталь Сіліцкі, за суседнім столікам сядзіць моладзь БНФ, нехта дзеліцца ўражаннем, што даўно не бачыў у Беларусі на адной сцэне столькі «забароненых» гуртоў.

«На сцэне гралі «Без білета», а зараз выйдзе «Крама»!» — паведаміў Віталік Артыст. «Мы б праспявалі «Падае дождж», але гэта было б здзекам», — злітаваўся з трохі абсохлай публікі Ігар Варашкевіч. «Сонца ў вочы, вецер у твар» — неслася са сцэны, а сонца тым часам хавалася ў чарговую хмару. З першымі акордамі «J:Морс» ад пляцоўкі пацягнуліся ручайкі людзей. Але без удзячнай публікі Уладзімір Пугач з калегамі не застаўся. «Дзе цябе носіць, я толькі на «Морсаў» сюды і прыехала!» — сварылася дзяўчына на сваю сяброўку, якая забавілася каля намётаў з гарбатай.

«А класна, што быў дождж — паддаў жарсці сёння», — падзяліўся хтосьці з гледачоў у спецыяльным аўтобусе, што вёз стомленую публіку за станцыі метро «Усход».

**Сямён Печанко**



**Ялфімава народ сустрэў прыязна.**

## Усё як у людзей

Опэн–эйр у Баравой параўнаем з леташнім опэн–эйрам у Нарвілішках. Bela music супраць Be2gether.

**Бяспека**

На Be2gether ахову забяспечвала па–літоўску негаваркая служба. На Bela music — міліцыя. Падчас выступу Ялфімава міліцыянеры падымалі над натоўпам рацыі: пэўна, каб пацешыцца ўсім райаддзелам. Людзі ў форме тлумачылі, чаму не варта пакідаць парасоны і торбачкі без нагляду. Так паводзяць сябе ахоўнікі грамадскага парадку падчас вялікай школьнай дыскатэкі, чым у вачах міліцыі мерапрыемства і было.

**Гук**

Адна любата. Саўнд Bela music’09 не саступаў Be2gether’2008.

**Харч**

На перасоўных прылаўках Bela music ляжаў дранік. І яшчэ шашлык, і беляшы, і курыца, і... глядзі загаловак артыкулу. Нацэнкі былі смешныя, як у краме «Кулінарыя». Алкаголю не было. У Літве ж летась нажыцца на студэнтах і маладых рокерах ніхто не саромеўся.

**Біяпрыбіральні**

Belamusic = Be2gether = амаль узорная чысціня.

**Атракцыёны**

На Be2gether было ўсякае–рознае, ад індыйскіх павільёнаў да штучнай гразюкі, дзе ахвочыя маглі паваляцца. На Bela music адзіным атракцыёнам былі агледзіны распілаванага самалёта наўзбоч тэрыторыі фэсту, на лётнішчы.

**Сімволіка**

У Нарвілішках беларусы махалі сотняй бел–чырвона–белых сцягоў, а на Баравой не было ніводнага, нават хоць якога. Лунаў адзіны плакат — векапомныя словы Пятра Ялфімава пра якасць уласнага спева на «Еўрабачанні». З іншага боку, што тут махаць? І так усё ясна.

**Вясёлка**

Была падчас фэсту і ў Літве, і ў нас. Значыць, складаныя кліматычныя з’явішчы ўваходзяць у абавязковую праграму ўсіх опэн–эйраў гэтага рэгіёну. Наагул, да выбрыкаў прыроды публіка была падрыхтаваная: цэлафан, парасоны, бабульчыны гумовікі ў асабліва прасунутых.

**ЛК**

## Сокалаў-Воюш пераклаў песню Рыбака

Сяржук Сокалаў-Воюш — культавы бард пачатку 90-х, аўтар словаў да паланэзу «Развітанне з Радзімай», цяпер жыве ў ЗША. «У сеціве песню Рыбака пачалі перакладаць адразу і шмат хто, — сказаў ён карэспандэнту «НН». — Мне пазванілі сябры і сказалі: «Сяржук, трэба перакласці як след». Я ўлёгся ў працу. У свеце шмат хлопцаў-спевакоў, з вачыма, якія свецяцца, але гэты у дадатак наш, беларус».

**Казка**

Ведаў я адну дзяўчыну.
З тых часоў прайшлі гады.
Мы плылі у аблачынах.
Хоць даўно… Ды сапраўды…

Прыпеў:
У казку я закаханы зноў.
Гэты боль здавён.
Можа быць звар’яцелы я,
Бо на мне праклён.

Сваркі ўдзень, каханне ўночы.
Так ніхто ніколі, не
Мне журбой не поўніў вочы,
Так не нёс у рай мяне.

Ростань лёс прынёс раптоўна.
Я прыспешваю хаду,
Каб усё пачаць ізноў нам,
Як знайду, цябе знайду.

А яна — казка, гэта так.
І мой боль здавён.
Можа быць, звар’яцелы я,
Бо на мне праклён.

## Як дактароў правакуюць на хабар

**Доктарку адной з сталічных паліклінік за 45 даляраў хабару (гэта быў аператыўны эксперымент) асудзілі на 6 гадоў калоніі з канфіскацыяй маёмасці.**

У галаве такое не ўкладваецца — за забойства чалавека, як у выпадку з пухавіцкімі самасуднікамі, суд даў сама болей 5 гадоў калоніі, а тут за 125 тысяч рублёў — на год болей ды з канфіскацыяй!

Гэтая дзікая гісторыя нагадала некалькі выпадкаў з майго жыцця. Колькі гадоў таму мая мама патрапіла ў гарадзенскі абласны анкалагічны цэнтр.

Праходзіла камісію, дзень правяла ў чэргах. У той дзень на бальнічных калідорах хадзіла некалькі маладых людзей, якія падыходзілі да хворых і іхніх сваякоў і пра нешта з імі загаворвалі. Адзін з іх падышоў і да чаргі, у якой стаяла мая мама. Загаварыў да яе суседкі.

Прадставіўся супрацоўнікам аддзелу па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю і прапанаваў супрацоўніцтва. Гаварыў, што ягоны аддзел мае інфармацыю, што нібыта многія лекары гэтай установы пад падазрэннем у органаў, нават КДБ, бо часта бяруць хабар. Спытаў, да каго з дактароў трэба зараз заходзіць, і прапанаваў паўдзельнічаць у эксперыменце.

Пры гэтым ён разгарнуў паперы і кіўнуў на іх — у сярэдзіне ляжала даляравая купюра.

Супрацоўнік патлумачыў, што паперчына пазначаная, што не трэба нічога баяцца, бо адказнасць за дачу хабару ў часе эксперыменту пацыент не нясе. Жанчына наадрэз адмовілася, сказала, што да гэтага доктара ёй не адзін раз яшчэ давядзецца ездзіць, што такіх спецыялістаў не так ужо і шмат. Тады малады чалавек памяняў тактыку — стаў гаварыць, што большасць пацыентаў, калі не ўсе, даюць дактарам хабар, і што злавіць кагосьці з іх на гарачым не складае праблемы. Ён нават паспрабаваў адабраць у жанчыны картку, каб запісаць яе прозвішча, але тут чарга не на жарт усхвалявалася, і супрацоўнік мусіў рэціравацца.

Іншы выпадак здарыўся з маім сваяком, якому трэба было пакласці сваю маму на дзённы стацыянар. А там на той момант не хапала месцаў. Каля пад'езду яго сустрэў знаёмы абэзавец. Даведаўшыся, куды той ідзе, сказаў прыблізна так:

«Усё адно ж даваць «на лапу» будзеш, я ж ведаю, то дай маю паперку, пазначаную».

Сваяк мой адмовіўся.

І яшчэ адна гісторыя, якую распавялі ў адной з мінскіх бальніцаў. Абэзаўцы нейкім чынам выведалі прозвішчы і кантакты некалькіх пацыентаў аднаго з лекараў. І пачалі ім тэлефанаваць, кажучы, што ведаюць пра факты вымагання ў хворых грошай. Абяцалі вярнуць тыя грошы, калі нехта з пацыентаў пагодзіцца на супрацоўніцтва. Доктара тады не арыштавалі.

**АВ, Гародня**

## ЕГУ? Угу?! Ого!

Праглядаючы беларускія інтэрнэт-рэсурсы, я час ад часу сустракаю самыя розныя меркаванні, якія датычацца Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту.

**ЕГУ — беларускі**

«Ды які гэта беларускі універсітэт!?», «Ды няма там нічога беларускага!», «маскальшчына» і іншыя абразлівыя словы і прамовы можна пачуць на адрас беларускай ВНУ у выгнанні.

Магу паспрачацца.

Ты вольны размаўляць на той мове, на якой табе зручней атрымліваць інфармацыю для сваёй адукацыі, для атрымання ведаў, для камунікацыі з калегамі і выкладчыкамі розных нацыянальнасцяў. Падкрэслю, што асабіста я ніколі не заўважаў якіх-небудзь праблем з беларускай мовай ва універсітэце. Але, безумоўна, гэта не значыць, што гэтай праблемы не існуе. Проста корань гэтай праблемы трэба шукаць у саміх студэнтах.

Ці можа хтосьці прапануе прымушаць размаўляць па-беларуску? Не і яшчэ тысяча разоў — не!

Кожны даходзіць да Беларушчыны сваім уласным шляхам. Сярод шматлікіх студэнтаў я чуў цікавую і імпануючую мне думку:

— Мае дзеці будуць хадзіць у беларускія дзіцячыя садкі, у беларускія школы, — казалі мае сябры і сяброўкі.

Самасвядомасць, самавызначэнне, нацыянальныя пачуцці і прыярытэты, розныя іншыя нюансы... Амаль ва ўсіх студэнтаў ЭГУ прысутнічаюць гэтыя элементы.

Нельга не ўлічваць і таго факту, што ў ЕГУ ёсць беларуская маладзёвая ініцыятыва StudAlliance, беларускі гістарычны гурток, ідзе выданне беларускіх кніг, праводзяцца самыя разнастайныя беларускія мерапрыемствы, якія і не марыліся студэнтам сённяшніх ВНУ ў Беларусі.

Доля беларускамоўных студэнтаў у ЕГУ будзе ў некалькі разоў вышэйшай, чым у любой ВНУ ў Беларусі.

**ЭГУ — еўрапейскі**

За свае падыходы да адукацыі ЕГУ пацярпеў ад сённяшніх уладаў.

ЕГУ — гэта прыклад вольнай, цікавай адукацыі беларусаў у еўрапейскім кантэксце. Еўрапейскі акцэнт, еўрапейскі подых, еўрапейскае асяроддзе пачынаецца з назвы універсітэту і ўваходу ў навучальны корпус ЕГУ і сканчаецца ў сэрцы кожнага маладзёна, што вучыцца тут, у Вільні.. Адкрытыя межы — студэнцкія абмены — еўрапейскія дыпломы — еўрапейскія перспектывы.

Дадам простую (падслуханаю мною) размову:

— Вітаю!

— О! Здароўкі!! А ты дзе была?

— Ды ездзілі з П. у Берлін.

— О-о! А чаму?

— Ды так проста, тут тры вольных дні было, таму вырашылі паглядзець нямецкую сталіцу, бо неяк толькі міма праляталі, а заляцець усё ніяк не атрымлівалася.

— Зразумела... А мы ў наступным месяцы з О. ляцім у Стакгольм, сяброўка запрасіла ў госці.

Каментары? Шкада, што ў звычайнай беларускай моладзі няма такіх магчымасцяў. Шкада, што людзі не могуць параўноўваць...

**Кірыла Атаманчык, студэнт ЕГУ, Вільня**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Уладзімеру Р. з tut.by.** Правапіс не змяняе арфаэпіі. Пішацца «Асвея, асвеякі», а вымаўляецца ўсё адно «Асьвея, асьвеякі».

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

### ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

# Сасіскавы цмок

Неяк жыў самотны цмок
На зямлі англійскай,
Ён замест полымя
Выдыхаў сасіскі.



Ўсе смяяліся з яго:
«Што за цмок-нязДара!
Дзе падзеліся твае
Полымя і пара?»

Небарака сумаваў:
«Горачка мне, гора,
Так, самотны і стары,
І памру ў пячоры.»

Даму сэрца цмок сустрэў
Неяк на Каляды,
Закахаліся яны
З першага пагляду.

Побач чмыхаюць цяпер,
Кожны з сваёй пыскі,
І пякуцца у агні
Смачныя сасіскі.

**Роберт Потл, пераклала Тацяна Папова**

### ЯК У ІНШЫХ




**Такія афішкі расклееныя ва ўсіх трамваях Львова. Нацыянальная моўная культура не бярэцца зніадкуль: яе выхоўваюць. Так было калісьці ў Чэхіі, так ёсць ва Украіне, так будзе калісьці і ў Беларусі.**

**Іван Шарэнда**

Збяры Кнігарню «Наша Ніва»













ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ

Еўрапейскі Гуманітарны Універсітэт



працягвае набор студэнтаў на бакалаўрскую праграму «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія» Еўрапейскага Гуманітарнага універсітэту.

**Навучанне ў ЕГУ гэта:**

— авалоданне дзвюма еўрапейскімі мовамі;

— фундаментальная падрыхтоўка ў галіне гуманітарных і сацыяльных навук;

— грунтоўныя веды па гісторыі, археалогіі, этналогіі, культурнай антрапалогіі, гісторыі мастацтва;

— магчымасць вучыцца ў «Крывіцкай Мэцы» — у Вільні;

— дыплом літоўскага дзяржаўнага ўзору, які прызнаецца ў Еўропе.

**Праграма «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія»:**

распрацаваная з улікам патрабаванняў універсітэтаў Еўропы;

з удзелам вядомых беларускіх гісторыкаў;

выкладаецца па-беларуску, на старэйшых курсах — і па-англійску, па-французску ці па-нямецку. Ёсць асобны курс літоўскай мовы і культуры.

прапануецца як у дзённым, так і ў завочным фармаце.

Даведкі: dept.history@ehu.lt



# Нараўляншчына

**Гэта не кірунак для звычайнага турызму, але адтуль вяртаешся з верай. Пра Нараўляншчыну піша Сяргей Харэўскі.**

Каб патрапіць у Нароўлю з Мінску, трэба рушыць праз Мазыр, праз славутыя даўжэзныя масты над Прыпяццю, праз заказнік «Мазырскія яры», праз трамвайную лінію між палёў, праз горы, лясы і рэкі... Варта ўехаць у Нараўлянскі раён, як сустракае знак радыяцыйнае небяспекі з папярэджаннем, што тут забаронена паліць вогнішчы і касіць траву. Але як вы прыехалі не па дровы і не па сена, вас грозныя знакі не тычацца. Дарогі тут дагледжаныя. Зрэшты, як і ўсё іншае. Статус абавязвае: наступствы вялікае катастрофы на АЭС у Чарнобылі, да якое адсюль — шэсцьсем дзясяткаў кіламетраў.

Нароўля сустракае зялёнымі шатамі дрэваў і вежамі з чырвонае цэглы, рыхтык гатычным замкам з зубцамі, выступамі, аркамі. Гэта слынная кандытарская фабрыка «Чырвоны мазыранін». Некалі тут быў цукровы завод і бровар паноў Горватаў. Гэтае найстарэйшае нашае прадпрыемства па вырабе слодычаў на адным з палотнаў увекавечыў Адам Глобус. Тут вырабляюць 70 гатункаў цукерак, а перадусім славуты зефір.

Прадмесцяў з прысадамі, з якіх пачынаюцца іншыя гарады, у Нароўлі няма. Дзікая прырода існуе сама сабой, а людзі жывуць побач, за бардзюрамі і платамі, асфальтам і бетонам.



**Нароўля**

райцэнтр у Гомельскай вобл. У крыніцах згадваецца з XVIII ст.Ад 1924 — у складзе БССР. Пад нямецкай акупацыяй быў у складзе рэйхскамісарыяту «Украіна». Частка раёну адселеная пасля катастрофы на ЧАЭС.

Паводле аднаго з паданняў, Нароўля атрымала назву ад ракі Нараўлянкі. Іншыя гісторыкі звязваюць назву з легендарнымі неўрамі, якіх згадваў Герадот. У Беларусі багата яшчэ тапонімаў і гідронімаў з коранем «нур», «нор»: Наўры, Нараўка, Нарва, Нурэц.

Галоўная адметнасць Нароўлі — палацавы комплекс Горватаў з шыкоўным паркам.

Нароўля—Галоўчыцы—Дзямідаў—Антонаў—Грушаўка—Вербавічы.

Сёння там жывуць адно здані... Двухпавярховая камяніца ў духу высокага класіцызму стаяла ў парку на стромым беразе Прыпяці. У будынак з чатырох бакоў вялі лесвіцы, перад палацам раслі старажытныя вялікія ліпы і пастрыжаны шарамі персідскі бэз...

Тузін гадоў таму з яго прыбралі школу. І ніхто не даў задання тамтэйшаму начальству палац зберагчы. Яго разрабавалі дашчэнту. Чыноўнікі ківаюць на хуліганаў і п'янтосаў, але... цяжка паверыць, што п'яныя хуліганы паздымалі падлогі, разабралі кахляныя печы і літыя чыгунныя балкончыкі...

Начальнікі хваляцца праектам рэстаўрацыі на 56 мільёнаў рублёў. Але ўратаваць палац — зрабіць надзейны дах, патынкаваць, пафарбаваць і замкнуць дзверы — каштавала б меней.

Болей пашанцавала старажытнаму парку, што разлёгся на восем гектараў. Яго векавечныя дубы і калматыя лістоўніцы памятаюць яшчэ часы Рэчы Паспалітае... Не дзіва, што ў Нароўлі нарадзіўся слынны батанік Мікалай Смольскі.

За палацам, на строме над ракою, ацалелі аскабалкі фантану з мураванымі ампірнымі лавамі. Захавалася паркавая альтанка-маяк на высокім беразе, ля ўтоку Нараўлянкі ў Прыпяць. Выкшталцоная і зграбная, яна і ёсць найлепшым сімвалам і талісманам гораду.

А поруч — рачны вакзал, дагледжаны і свежапафарбаваны. Гатовы сустрэць пасажыраў. Але ніхто сюды не прыплывае. Штурвал ад рачнога карабля, якар — тужлівыя сімвалы вінаватасці без віны, закінутасці некалі квітнеючага краю.

Уся Нароўля падобная на вялікі піянерлагер. Так тут усё вымецена, пафарбавана і падгрэбена. Звонкія фарбы, бліскучая металадахоўка, новыя шклопакеты, мора зеляніны ў квецені ніяк не асацыююцца з небяспекай, што тоіць нябачны звер радыяцыі. Нават манумент у памяць Чарнобылю з пералікам выселеных вёсак застаўлены караблікам з пунсовымі ветразямі, вядомым са школы, — вобразам надзеі і мараў.

І паўсюль, рыхтык у лагеры, — дзеці. Лояць рыбу і гуляюць ў футбол, ідуць у кіно і па марозіва, у школу і са школы мастацтваў, фантан перад якой упрыгожыў старасвецкі вазон з панскага палацу... Воля да жыцця, жарсны аптымізм тутэйшых людзей захапляе. Пачынаеш сам верыць, што ўсё можна адолець.

### Казацкія катлы, скіфскія амфары і рэспіратар

У горадзе мала захавалася помнікаў старасвеччыны. Стаіць адметны драўляны будынак былое бальніцы пачатку ХХ ст. з традыцыйным для палескага дойлідства разьбяным дэкорам. У ім цудоўны Этнаграфічны музей. Тут і інтэр'еры, і артэфакты, і вялізарная калекцыя ткацтва, і экзатычныя прылады тутэйшых рабакоў ды паляўнічых. Ужо дзеля гэтага музею сюды варта ехаць.

Гісторыка-краязнаўчымі музеямі ў школах рупіцца Васіль Чайка, апантаны краязнаўца. Сам блукае па адселеных зонах, збірае тое, што дапамажа зберагчы для будучых пакаленняў памяць... Школьным музеям Нароўлі пазайздросціць любы раённы цэнтр. Тут і казацкія катлы, і скіфскія амфары, улёткі часоў УНР, зброя і абразы, старыя радыёпрымачы і каменныя сякеры. А калі даведзецца паслухаць Васіля Чайку — проста моцна пашанцуе. Ён распавядзе і пра казачыну, і пра жыццё ў рэйхскамісарыяце «Украіна», і пра чарнобыльскі хаос... Адзін з самых драматычных экспанатаў у школьным музеі — саматужны рэспіратар, што пашыла бабка са старое паркалёвае наўлечкі ў кветкі.

### Сядзібы Горватаў і Аскеркаў

Замест старых храмаў у Нароўлі паўсталі новыя. Самы цікавы з іх — касцёл Святога Крыжа, перароблены з колішняга РУУСу. Цяпер гэта велічны храм з вітражамі, дыхтоўнай мэбляю, прасторнай, але па-хатняму ўтульнай плябанню.

Новы праваслаўны Свята-Яна-Багаслоўскі храм уладкаваны таксама ў былым свецкім будынку, але як ён хораша, з любоўю, уладкаваны!

Недалёка шуміць пярэсты палескі кірмаш. Адны кабеты гавораць чыста па-беларуску, іншыя — амаль чыста па-ўкраінску. Уся Нараўляншчына тут, як на выставе...

У старажытнае мястэчка, а цяпер аграгарадок Галоўчыцы варта заехаць, каб пабачыць яшчэ адзін палац мажнаўладцаў Горватаў. Як і ў Нароўлі, захаваўся шыкоўны парк. Толькі палац цэлы, бо ў ім абсталявалі амбулаторыю.

Аўтарам праекту яго галоўнай брамы быў славуты варшаўскі дойлід Тадэвуш Раставароўскі. Атвор у выглядзе двух паўколам выпнутых у бок парку белых муроў нібы абяцае нешта неверагоднае ў хараստве і велічы... Высакароднасць простых формаў і грацыёзнасць калонаў ствараюць урачыстую атмасферу.

З Галоўчыц дарога вядзе наўпрост на Дзямідаў, колішнія Дзямідавічы, вёску, вядомую ў гісторыі раней за Нароўлю. Там нарадзіўся Юры Жыгамонт, вядоўца памятнай тэлеперадачы «Падарожжа дылетанта».

Між Дзямідавым і Антонавым дарога грунтавая. Вёска Антонаў над ракой Славечнаю — тут гідронімы ўжо не балцкія, як у большай частцы Беларусі, а славянскія — слынная беларускімі песнямі, якіх нямала пазапісвалі фалькларысты. На другім беразе захаваліся парэшткі замку Аскеркаў, дзе знаходзяць сярэднявечную кахлю ды іншыя цікавосткі.

За Славечнай у свой час пачыналася Кіеўскае ваяводства Каралеўства Польскага, затым Кіеўская губерня. Гаворкі тут ужо ўкраінскія. Але цяпер большасць вёсак, да самае ўкраінскае мяжы, адселеныя.

### Крыж італьянкі

Уражвае і сакавітая ўкраінска-польская трасянка ў Грушаўцы, цэнтры тутэйшых каталікоў. Рыма-каталікі ў Аляксандраўцы, Мальцах, Габрыэлеўцы, Чэхах, Лубені, Свячы жылі ад часоў, як гэты закутак у XVII ст. трапіў у склад Кароны Польскай. Грушаўка належала галоўчыцкім Горватам. У 1916 г. жонкаю Станіслава Горвата стала італьянская графіня Францішка Анэля Паўленс дэ ла Рохе. Пабожная графіня загадала паставіць у Грушаўцы крыж, запрасіла біскупа асвяціць месца будучай капліцы... Пабудаваць да 1917-га не паспелі. Але зацятыя грушаўцы маліліся па хатах.

Старыя не могуць стрымаць слёз, апавядаючы, што ім выпала перажыць за веру. Сорак мужчын былі расстраляныя за Сталінам. Усе савецкія гады грушаўцы ездзілі да касцёлу ў Житомір, пасля сюды таемна наязджалі ксяндзы. Ацалеў да нашых дзён і стары крыж з касцяным Укрыжаваннем, што ставіла яшчэ пані Францішка Горват! Ён стаіць у полі 94-гадовай Антаніны Жураўскай. Пад гэтым крыжам пачаліся адкрытыя маленні ў 1988-м. Цяпер велічны касцёл Божае Міласэрнасці здалёк бялее на высокім пагорку пасярод вёскі. Мара людзей і пані Горватавай здзейснілася праз 82 гады.

Перад вяртаннем у Нароўлю варта заехаць у Вербавічы, каб убачыць барочную Параскева-Пятніцкую царкву XVIII ст. За савецкім часам тут быў музей. Цяпер ізноў дзівосны храм стаў храмам. Дай Бог збавення гэтаму прыгожаму краю над Прыпяццю.

**У цыкле «Маршруты па Беларусі» ў папярэдніх нумарах**

«Край за небакраем, або Беларуская Прусія» (Сапоцкінчына) № 12

«Мяжа Усходу і Захаду» (Жыткавіцкі і Лельчыцкі раёны) №13

«Балдук mon amour» (край Блакітных азёраў) №14

«Мазырскае барока» № 15

«Край белай птушкі» (Асвейшчына) №16

«Котра. Рака і пушча» №17

«Любань. Над ракой Арэсай» №18

# Падарожжа Мюнхгаўзена,
## або Калі прыдумалі Усходнюю Еўропу?

**Усходняя Еўропа для вандроўніка XVIII ст. — край фантастычных прыгод сярод лютых звяроў, перамога над якімі была метафарай цывілізацыйнай перавагі. Піша Алег Дзярновіч.**

### Самавынаходніцтва Захаду

Многія гістарычныя і палітычныя рэаліі, якія ўяўляюцца нам як аб’ектываваная спадчына стагоддзяў, насамрэч у свой час былі «вынайдзеныя» — гэта значыць уяўленыя і сканструяваныя. Тое самае можна сказаць і пра такую з’яву, як «Усходняя Еўропа».

У XVIII ст. французскія мысляры і падарожнікі «адкрылі» і апісалі Усходнюю Еўропу як нейкі адзіны рэгіён. Менавіта тады вось уяўнай геаграфіі Еўропы была пераарыентаваная з апазіцыі «Поўдзень—Поўнач», дзе роля адсталай і дзікай была замацаваная за «Поўначчу», на апазіцыю «Захад—Усход». Галоўнай характарыстыкай грамадства на ўсходзе кантыненту робіцца нейкі пераходны стан паміж цывілізаваным Захадам і варварскім Усходам, засвойванне цывілізацыі аказваецца павярхоўным, а аснова гэтых грамадстваў застаецца варварскай. «Вынаходніцтва» Усходняй Еўропы непарыўна звязанае з (сама)вынаходніцтвам Захаду. Усходняя Еўропа, у такім выпадку, выступае ў якасці адрозната арыенціру ў працэсе фармавання ўласнага вобразу цывілізаванай Заходняй Еўропы. Пішучы пра Усходнюю Еўропу, філосафы эпохі Асветніцтва усталёўвалі нейкую «нарматыўную» цывілізаванасць.

Сучасны амерыканскі даследчык Лары Вульф праанілізаваў разнастайныя мемуары і прыватнае ліставанне вядомых гістарычных асобаў другой паловы XVIII ст. Менавіта іх выказванні, замалёўкі і высновы дазваляюць рэканструяваць працэс «вынаходніцтва» Усходняй Еўропы як культурнага, а не «натуральнага» аб’екту.

Філасофская геаграфія была гульнёй з велімі вольнымі правіламі — настолькі вольнымі, што лічылася цалкам дапушчальным апісваць Усходнюю Еўропу, ніколі ў ёй не пабываўшы. Некаторыя ж адпраўляліся ў вяжы, перапоўненыя невераґоднымі чаканнямі і ў суправаджэнні міжнароднай шуміхі. У 1776 г. мадам Жафрэн, уладальніца аднаго з самых знакамітых літаратурных салонаў, пакінула Парыж, каб наведаць караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста, а ў 1773 г. Дзідро накіраваўся ў Санкт-Пецярбург, каб задаволіць патрэбы ў інтэлектуальных кантактах Кацярыны II. Тым не менш, ніхто не пісаў пра Расію з большым энтузіязмам, чым Вальтэр, які ніколі не бываў усходней за Берлін, і ніхто не адстойваў незалежнасць Рэчы Паспалітай з большай энергіяй і красамоўствам, чым Русо, які ніколі не выязджаў усходней за Швейцарыю.

### Снег і агонь

У 1784 г. граф Луі-Філіп дэ Сегюр выправіўся з Францыі ў Расію як паўнамоцны і надзвычайны пасол Людовіка XVI у Санкт-Пецярбурзе, пры двары Кацярыны II. Спыніўшыся праездам у Берліне, Сегюр быў прыняты ў Патсдаме немалаедам і ў той час ужо легендарным каралём Фрыдрыхам II.

Ведаючы, што пасол паедзе праз Рэч Паспалітую, кароль не ўтрымаўся ад каментароў да вобразу гэтай дзяржавы: «Вольны край, дзе народ у няволі, рэспубліка пры каралі, велізарная краіна, дзе амаль ніхто не жыве». І далей: «Вышэйшыя класы Рэчы Паспалітай — выдатныя ваяры, але іх арміі бракуе дысцыпліны. Мужчыны гэтай дзяржавы адважныя, але цвёрдасцю характару, нават гераізмам, вылучаюцца іхнія жанчыны; таму, кпліва заўважыў Фрыдрых, «гэтыя жанчыны — сапраўдныя мужчыны». Прускі кароль назваў Рэч Паспалітую «займальнаю краінай», у ацэнках якой выкарыстаў мову парадоксаў і супярэчнасцяў. Ці не падобны прыём дапамог яму ў 1772 г. прапанаваць праект першага падзелу Рэчы Паспалітай?

Сам Сегюр апісваў ужо Гродна па звыклай формуле кантрастаў: «...сумесь запусцелых хацін, напаўразваленых дамоў, палацаў, якія ляжаць у руінах, але аздобленых цудоўнымі брамамі, рэшткамі мінулай велічы».

Ён наведаў нядаўна заснаваную надворным падскарбіем ВКЛ Антоніем Тызенгаўзенам ткацкую мануфактуру і таму, што ягоная краіна ганарылася ткацкаю вытворчасцю, заўважыў з паблажлівай цікавасцю: «Гэтая галіна прамысловасці тут толькі яшчэ ў зародку».

У Варшаве Сегюру настойліва раілі адкласці ад’езд у Санкт-Пецярбург — пачыналася зіма 1784—1785 гг., пайшоў снег. Падарожнік не стаў чакаць і потым пашкадаваў пра гэта. Ён мог праехаць па снезе толькі ў лёгкіх санях. Давялося пакінуць багаж на захаванне недзе «паміж Беластокам і Рыгаю». Пазней яму паведамілі, што той згарэў. З уласцівай Усходняй Еўропе парадаксальнасцю «снег і агонь аб’ядналіся, каб мяне пакараць», — занатуе Сегюр.



**Гюстаў Дарэ. Мюнхгаўзен з канём на гарбатным століку.**

### Мядзведзь з адкрытай пашчай

Уяўленне пра Усходнюю Еўропу як рэгіён, дзе пануюць фантазіі, адлюстравалася ў «Вандраваннях і дзіўных прыгодах барона Мюнхгаўзена» Рудольфа Эрыка Распэ. Як і герой твору, Распэ быў немцам, але, дзякуючы дынастычным сувязям англійскага каралеўскага двара і ягонага роднага Гановеру, службу аўтар адбываў на абодва бакі Ла-Маншу. «Прыгоды Мюнхгаўзена» былі апублікаваныя па-англійску ў 1785 г., і, дзякуючы перакладу 1786 г. на нямецкую мову, атрымалі велізарную папулярнасць. Такім чынам, кніга ўпершыню выйшла ў свет, калі паездка Сегюра па такім самым маршруце падыходзіла да заканчэння.

Першае, што ўбачыў Мюнхгаўзен ва Усходняй Еўропе, быў «бедны стары», які «ляжаў на пажоўклым лузе ў Польшчы, пасярод дарогі, бездапаможны, дрыжаў, ледзь меў чым прыкрыць сваю галізну». Гэта — апошняе звыклае відовішча, сустрэтае ім па дарозе ў Санкт-Пецярбург, а таксама адзін з апошніх эпізодаў, дзе ўдзельнічаюць людзі. Для Мюнхгаўзена Усходняя Еўропа — край фантастычных прыгод сярод лютых звяроў, перамога над якімі была метафарай заваёў і цывілізацыйнай перавагі.

Памятнай і поўнай задавальненняў была ягоная сустрэча з мядзведзем:

«Аднойчы ў польскім лесе і светлы час сутак, і порах падышлі да канца. Калі я ўжо кіраваўся дадому, жахлівы мядзведзь пагнаўся за мной з велізарнаю хуткасцю, з раскрытаю пашчай, гатовы накінуцца на мяне. Імгненне я абшукаў усе кішэні ў пошуках куль і пораху, але дарэмна: я знайшоў толькі два запасныя крэмені. Адзін я кінуў з усяе моцы ў адкрытую пашчу пачвары, ды патрапіў яму проста ў самую глотку. Ад гэтага яму зрабілася балюча і прымусіла павярнуцца кругам, так што я мог пацэліць другім крэменем проста яму ў чорны ход, што і зрабіў з незвычайным поспехам. Ён заляцеў усярэдзіну, сутыкнуўся ў страўніку з першым крэменем, высек агонь, і страшэнны выбух разарваў мядзведзя».

Такімі апісаннямі поўніцца ўся кніга пра Мюнхгаўзена. Адчуваюцца далёкія паралелі з маркізам дэ Садам і ягонай «Гісторыяй Жульеты», у якой Усходняя Еўропа была найперш арэнай анальных згвалтаванняў, хоць ягоныя героі і гераіні знаходзілі дзеля гэтага магчымасці і ў іншых частках зямной кулі. Героі дэ Сада аддаваліся самым дзікім і садысцкім сексуальным подзвігам, у шмат чым аналагічным таму, што вырабляў Мюнхгаўзен з звярыма Усходняй Еўропы. Але ж фантазіі дэ Сада патрабавалі чалавечых ахвяраў.

Практыкаванні ж барона Мюнхгаўзена з жывёламі не заўжды прыводзілі да лятальнага канца. Аднойчы ён наведаў «нейкую сядзібу ў Літве» і пабачыў каня, якога ніхто не асмельваўся аб’ездзіць:

«Адным махам я апынуўся ў яго на спіне, чаго ён не чакаў, і прывёў яго да мяккасці і пакорлівасці з дапамогаю майстэрскіх прыёмаў верхавой язды, якімі я валодаў дасканала. Каб цалкам прадэманстраваць гэта дамам і зберагчы іх ад непатрэбных турботаў, я прымусіў яго адным разам скочыць у адчыненае акно гасцёўні, прайсціся некалькі разоў вакол крокам, рыссю і галопам і, нарэшце, ускочыць на гарбатны столік, чароўна паўтарыўшы там свой урок у мініяцюры, што выклікала надзвычайнае задавальненне дам, бо ён зрабіў усё настолькі дзівосна, што не пабіў ніводнай філіжанкі ці спадачка».

Дзякуючы майстэрскай верхавой яздзе, барон Мюнхгаўзен выразшыў асноўную для Усходняй Еўропы супярэчнасць паміж дзікасцю і цывілізаванасцю, якую сімвалізаваў конь на століку для гарбаты. Вядома, яму адразу ж прапанавалі каня ў прэзент. І ён адправіўся на сваім літоўскім скакуне на бітву з туркамі ў складзе расійскага войска.

Дзіўныя прыгоды адбываліся менавіта ва Усходняй Еўропе, бо паблізу знаходзілася Азія, а крыху далей — адкрыты космас.

У выніку свайго вайсковага і дыпламатычнага майстэрства Мюнхгаўзену, як «найлепшаму жаўнеру і паляўнічаму Усходняй Еўропы», удалося ўсталяваць мір паміж Расіяй і Турцыяй. Ён адправіў каманду расійскіх сапёраў і скіраваўся да Суэцкага перашыйку, дзе далучыў да свайго атраду мільён туркаў, узброеных рыдлёўкамі і кіркамі. Яны сабраліся не дзеля таго, каб рэзаць адзін аднаму гор-



**«Каралева Еўропа». Алегарычная мапа Новага часу.**

ла, а каб, да іхняй агульнай выгоды, спрыяць гандлю і цывілізацыі, каб усе багацці Індыі пацяклі праз гэты новы канал у Еўропу».

Такім чынам, Мюнхгаўзен абраў найлепшы спосаб садзейнічаць справе цывілізацыі і ўсталявання сувязей паміж Еўропай і Азіяй, выкарыстоўваючы рабскую працу мільёнаў чалавек. Нібы ў працяг фантазій Мюнхгаўзена, французскі дыпламат і інжынер Фердынанд дэ Лесэпль, атрымаўшы ў 1854 і 1856 гг. ад егіпецкага ўладара Саіда-пашы канцэсію на будаўніцтва Суэцкага каналу, для земляных прац выкарыстоўваў прымусовую працу бедных слаёў насельніцтва Егіпту.

## Пра плыткасць межаў

Уяўленні пра абшары Усходняй Еўропы пратрывалі праз усё XIX і XX ст., і ім не змаглі перашкодзіць спробы самарэфлексіі інтэлектуалаў саміх гэтых краін, якія ўспрынялі канцэпцыю Цэнтральнай Еўропы. Таму Уінстану Чэрчылю так лёгка было ў Ялце ў лютым 1945 г. аддаць Сталіну якраз тую частку Еўропы, пра якую ён так пранікнёна скажа ўжо 5 сакавіка 1946 г. у сваёй лекцыі ў Фултане, штат Місуры: «Ад Шчэціна на Балтыцы да Трыесту на Адрыятыцы жалезная заслона апусцілася праз увесь кантынент». Гэтай фразе пра «жалезную заслону», якая падзяліла Еўропу на дзве часткі, заходнюю і ўсходнюю, было наканавана стаць самай удалай рытарычнай знаходкай Чэрчыля ва ўсёй яго палітычнай кар'еры.

Хоць справядліва будзе адзначыць, што ўяўленні пра вобраз і межы Усходняй Еўропы не застаюцца нязменнымі. Пасля таго, як Польшча, Чэхія, Вугоршчына, а таксама Літва і Латвія ўвайшлі ў еўраатлантычныя структуры, паняцце Усходняй Еўропы звужаецца і канкрэтызуецца. Цяпер у амерыканскіх даследчых і навучальных праграмах як асобны памежны рэгіён разглядаюцца тры краіны — Беларусь, Украіна і Малдова, — якія знаходзяцца паміж Расіяй і Еўрапейскім Саюзам. Праграма «Усходняга партнёрства» фактычна пашырае межы Усходняй Еўропы на Паўднёвы Каўказ.

Усходняя Еўропа, аднойчы вынайдзеная, працягвае жыць па сваіх канонах — як усялякі культурны феномен.

# НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

## Вертыкаль ВКЛ

**Urzednicy Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Spisy. Tom II: Wojwodztwo trockie XIV—XVIII wiek / Pod red. Andrzeja Rachuby; opracowali Henryk Lulewicz, Andrzej Rachuba, Przemyslaw P. Romaniuk, Andrzej Haratym, przy wspolpracy Andreja Macuka i Jaugiena Aniszczanki. — Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2009. — 678 s.**

**(Урадніківі Вялікага Княства Літоўскага. Спісы. Том II: Троцкае ваяводства XIV—XVIII ст. / Пад рэд. Анджэя Рахубы; апрацавалі Генрык Люлевіч, Анджэй Рахуба, Пшамыслаў П. Раманюк, Анджэй Гаратым, пры супрацоўніцтве Андрэя Мацука і Яўгена Анішчанкі. — Варшава: DiG, 2009. — 678 с.).**

Выданне працягвае маштабную серыю пра ўраднікаў, гэта значыць службовых асобаў Вялікага Княства Літоўскага па розных рэгіёнах. Методыка наступная: з датаваных дакументаў бяруцца згадкі ці наўпроставыя ўказанні, хто займаў тую ці іншую пасаду ў канкрэтны год. Потым звесткі сумуюцца і складаюцца адпаведныя табліцы. У выніку маем храналагічныя спісы: хто і калі займаў тую ці іншую пасаду (кашталяна, будаўнічага, харужага, чашніка, крайчага, лоўчага, скарбнага і г. д.) да адміністратыўна-тэрытарыяльнай рэформы 1565—1566 гг. Троцкае ваяводства ахоплівала палову тэрыторыі сённяшняе Беларусі. Раней ужо выйшлі з друку спісы цэнтральных ураднікаў ВКЛ (1994 г.), ураднікаў Смаленскай зямлі і Смаленскага ваяводства (2003 г.), Віленскага ваяводства (2004 г.).

## Пра падаткі і пра ахвяры

**Metryka Litewska: Rejestry podymnego Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Wojewodztwo mscislawskie 1667 r. / Opracowal Andrzej Rachuba. — Warszawa: DiG, 2008. — 95 s.**

**(Літоўская Метрыка: Рэестры падымнага падатку Вялікага Княства Літоўскага. Мсціслаўскае ваяводства, 1667 г. / Апрацаваў Анджэй Рахуба. — Варшава: DiG, 208. — 95 с.)**

Што дае для асэнсавання гісторыі прагляд гэтага дакументу з радкамі прозвішчаў, апісаннем маёмасці і ўказаннем велічыні падатку? Перш за ўсё, апроч генеалагічных звестак, перад намі важны матэрыял па дэмаграфіі і падстава для роздуму над цаной вайны. Мсціслаўскае ваяводства займала тэрыторыю ў 11 505 кв.км., на якіх у 1667 г. размяшчалася 4237 «дымоў» (то бок дамоў, якія мелі печы). Калі за сярэднюю лічбу жыхароў аднаго «дыму» браць 7,5 чалавек, як прапануюць даследчыкі, то атрымліваецца, што Мсціслаўшчыну ў 1667 г. насялала 31 778 чалавек, ці 2,8 чалавека на кв. км. Гэта адзін з найменшых паказчыкаў для ўсяго Вялікага Княства.

Але такая малая заселенасць ваяводства сталася вынікам велізарных стратаў пад час войнаў сярэдзіны XVII ст. — спачатку, калі Усход Беларусі быў арэнаю змагання з казацкімі аддзеламі, высланымі Багданам Хмяльніцкім у 1648 г., потым працяглай, звязанай з высяленнямі ў глыб Расіі мясцовых жыхароў, маскоўскай акупацыяй 1654—1667 гг. Перад вайной Мсціслаўскае ваяводства налічвала 13 769 «дымоў» з 110 152 жыхарамі, што давала шчыльнасць насельніцтва 9,6 чалавек на кв.км. Такім чынам, страты Мсціслаўшчыны склалі каля 71% насельніцтва, што было адным з самых вялікіх паказчыкаў падатку смерці і дэпартацыяў у Вялікім Княстве Літоўскім.

## 30 000 сёстраў

**S. Malgorzata Borkowska OSB. Leksykon zakonnic polskich epoki przedrozbiorowej. T. III: Wielkie Ksiestwo Litewskie i Ziemie Ruskie Korony Polskiej. — Warszawa: DiG, 2008. — 370 s.**

**(Сястра Малгажата Баркоўская OSB. Лексікон польскіх манашак эпохі перад Падзеламі. Т. III: Вялікае Княства Літоўскае і Рускія землі Кароны Польскай. — Варшава: DiG, 2008. —370 s.)**

Сястра Бенедыктынскага ордэну Малгажата Баркоўская на працягу трыццаці гадоў збірала звесткі пра манашак Рэчы Паспалітай. У яе картатэцы — каля 30 000 імёнаў. Чарговы том яе выдання падае біяграфічныя звесткі і спісы манашак з тэрыторыі Вялікага Княства і Украіны — менавіта Украіна маецца на ўвазе пад гістарычным тэрмінам «Рускія землі Кароны Польскай».

У даведніку падаюцца звесткі пра законніц усіх канфесіяў: рыма-каталіцкіх, грэка-каталіцкіх, праваслаўных. Полацкае манаскае жыццё пачынаецца ў даведніку ад Ефрасінні. Характэрная рыса: «рэкрутацыя» ў жаночыя манастыры адбывалася ў першую чаргу лакальная, гэта значыць, што сюды ішлі дзяўчаты і жанчыны з тых самых рэгіёнаў, у якіх знаходзіліся гэтыя манастыры.

Аўтарка адзначае, што на «рускіх» землях жаночыя манастыры паўсталі ўжо ў XI ст., у той час як у Польшчы толькі ў канцы XII ст. Жаночыя ж кляштары лацінскага абраду з'явіліся ў Вялікім Княстве і ва Украіне ў канцы XVI ст. — з фундацыяў бенедыктынак у Нясвіжы і Львове.

Агулам беручы, на землях Беларусі і Украіны жаночых манастыроў усходняга абраду было болей, чым заходняга. Але праваслаўныя манастыры значна горш задакументаваныя. Ва Уніяцкай царкве ўплыў заходняй дысцыпліны, як зазначае аўтарка, прывёў да складання, прынамсі, у некаторых дыяцэзіях спісаў базыліянак, але толькі ў другой палове XVIII ст. Хоць, да прыкладу, у мінскім кляштары Святога Духа (што размяшчаўся ў Верхнім горадзе, і ў будынку якога цяпер знаходзіцца музычная школа) ад пачатку фундацыі ў 1651—1664 гг. складалася нават рэгулярная метрыка ўступленняў у кляштар.

**Алег Дзярновіч**




## КАНЦЭРТЫ

### Кася Камоцкая ў Мінску

Спявачка Кася Камоцкая выступіць **27 мая ў 13.00 у кавярні кінатэатру «Цэнтральны» (пр.Незалежнасці, 13)** на імпрэзе фотаконкурсу «Будзьма беларусамі!»

### Зміцер Вайцюшкевіч у Мінску і Гомелі

**2 чэрвеня ў 19.00 у мінскім клубе «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — канцэрт музыкі З.Вайцюшкевіча. Замова месцаў і дадатковая інфармацыя: (029) 179–99–18, (029) 613–95–06. Вялікі канцэрт З.Вайцюшкевіча адбудзецца **4 чэрвеня ў гомельскім Гарадскім цэнтры культуры**. **Пачатак а 19-й.**

### «Крама» ў Гродне

Канцэрт гурту ладзіцца **4 чэрвеня ў гродзенскім ліцэі №1**. **Пачатак а 19-й.**

### Алесь Камоцкі ў Купалаўскім музеі

Алесь Камоцкі запрашае ўсіх: і тых, хто ведае, у чым справа, і тых, хто не ў курсе, паслухаць старых і новых песень **9 чэрвеня ў 19.00**. **Уваход вольны.**

### Польскі джазмэн Павал Качмарчык

**27 мая ў Вялікай канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі** — канцэрт Паўла Качмарчыка і яго Audiofeeling Band. Павал Качмарчык прыязджае ў Мінск з выдатнымі польскімі джазмэнамі, кожны з якіх з'яўляецца зоркай — саксафаніст Радэк Навіцкі, басіст Войцех Пульцын і барабаншчык Павал Дабравольскі. **Пачатак а 19-й.**

### Affabre concinui

**29 мая а 19-й ў Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў** — канцэрт польскага вакальнага калектыву «Affabre concinui». У праграме: джазавыя кампазіцыі, класічныя і сучасныя творы, поп–хіты XX ст., аркестравыя працы, музычныя жарты. **30 мая** — канцэрт **у Архікатэдры імя Насвяцейшай Марыі Панны**. У праграме — музыка эпохі Адраджэння, страдаўняя рэлігійная польская і еўрапейская музыка. Вольны ўваход.

### Jazz -Jazz

Першы сумесны канцэрт джазавых музыкантаў «Diagilew project» (Германія) з удзелам вядомага джазавага піяніста Канстанціна Гарачага («Apple Tea») і беларускай этна–джазавай групы «Akana–NHS» пройдзе **5 чэрвеня на сцэне сталічнага Моладзевага тэатру эстрады (вул.Маскоўская, 18а)**. Упершыню ў Беларусі нямецкі джаз і беларускія этнічныя песні загучаць разам. **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

### Сустрэча з Уладзімірам Арловым

Сустрэча адбудзецца **ў Баранавічах (вул.Камсамольская, 28-65) 30 мая**. Тэма сустрэчы — «Мілавіды: змаганне за незалежнасць». **Пачатак а 16-й.**

### Прэзентацыя інтэрнэт-часопісу перакладной літаратуры

**27 мая ў музеі Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а)** адбудзецца прэзентацыя першага нумару інтэрнэт–часопісу перакладной літаратуры «ПрайдзіСвет». Удзел возьмуць Васіль Сёмуха, Андрэй Хадановіч, Валянцін Акудовіч, Марыйка Мартысевіч, Віталь Рыжкоў. **Пачатак а 19-й.**

### «Тарас на Парнасе» ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры

**Музей гісторыі беларускай літаратуры** запрашае **27 мая а 16-й гадзіне** на паэтычны вечар «Класіка беларускай літаратуры на мовах свету».

### Аўдыёкніга Уладзіміра Караткевіча

Прэзентацыя аўдыёкнігі Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» адбудзецца **28 мая ў канферэнц-зале Пушкінскай бібліятэкі (вул.Залатая Горка, 19)**. Таксама ў праграме — прагляд дакументальнага фільму пра жыццё і творчасць У.Караткевіча. **Пачатак а 18-й.**

### Літаратурны фестываль Lesebühne Deutsch

Пасля турнэ па розных беларускіх гарадах нямецкія аўтары Філіп Шарэнберг, Мікіта Гарбуноў і Тобіас Борке сустрэнуцца **29 траўня ў Доме дружбы (вул.Захарава, 28)** на літаратурным фестывалі Lesebьhne Deutsch, дзе да іх далучыцца Віктар Жыбуль. **Пачатак а 18-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Закрыццё выставы майстроў сучаснага польскага мастацтва

**26 мая Польскі Інстытут у Мінску і Музей сучаснага выяўленчага мастацтва** запрашаюць на ўрачыстае закрыццё выставы графікі Іяны Пех і плакату Рамана Каларуса з удзелам аўтараў.

### Беларускі павільён Венецыянскай біенале ў Мінску

Другі раз за ўсю гісторыю Венецыянскай біенале беларускія мастакі возьмуць у ёй удзел: у Мінску адкрыецца неафіцыйны Беларускі павільён 53–й Венецыянскай біенале. У экспазіцыі творы 30 беларускіх мастакоў, скульптараў і фатографаў розных пакаленняў. Выстава пройдзе **у НВЦ «БелЭКСПА» (вул.Я. Купалы, 27) з 3 па 6 чэрвеня**.

### Выставы ў Палацы мастацтва

**Палац мастацтва (вул.Казлова, 3) запрашае да 31 мая** наведаць выставу жывапісу Віталя Цвірко, мастацкую выставу «Мастак і кніга» і фотавыставу «Адзін дзень у Чэшскай рэспубліцы».

### «Суб'ектыўны погляд»

У рамках эксперыментальнага фотапраекту «Суб'ектыўны погляд» адбудзецца серыя фатаграфічных выставаў, дзе будуць прадстаўленыя як працы знаных беларускіх фатографаў, так і фотаздымкі з прыватных калекцыяў. **Працуе да 2 чэрвеня па адрасе: пл. Незалежнасці, ГЦ «Сталіца» (PhotoGallery ZHЯТА, зала «ЦэнтрВідэа»).**

### Слуцкія паясы

**У Нацыянальным мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** праходзяць выставы «Слуцкія паясы», «Гістарычны партрэт Беларусі XVI—XIX стагоддзяў» і выстава жывапісу Васіля Касцючэнкі — **да 23 чэрвеня**.

## ТЭАТРЫ

### 28 мая

**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

### 29 мая

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Ігвіта, або Як гэта рабілі ў Францыі»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Тэатр оперы і балету** — «Спячая прыгажуня»

### 30 мая

**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»
**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда аб бедным д'ябле»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»

### 31 мая

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Музычны тэатр** — «Стойкі алавяны жаўнерык»
**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севіллі»
**Тэатр оперы і балету** — «Цэрам–цэрамок»
**Тэатральны каўчэг** — «Сублімацыя кахання»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»

### 1 чэрвеня

**Цэнтральны Дом афіцэраў** — «Выкраданне Сабінянінава»

### 2 чэрвеня

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

### 3 чэрвеня

**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Мінулае



**Мінулае** (El pasado)

Аргентына — Бразілія, 2007, каляровы, 114 хв.

Рэжысёр: Эктар Бабенка

Жанр: Псіхалагічная драма паводле раману Алана Паўлса

Адзнака: 6 (з 10)

Праз 12 гадоў шлюбу перакладчык Рыміні разыходзіцца са сваёю жонкай Сафі. Але мінулае не адпускае герояў… Карціну многія палічаць годным практыкаваннем у людской псіхалогіі. Тут ёсць палкімя эратычныя сцэны, гісторыя любові, да якой вяртаецца чалавек.

Але гэтае прачытанне памылковае. Тое, што называюць у фільме каханнем, ёсць формай залежнасці. Гэта ціхая манія, апантанасць, няхай сабе стомленая і пры гальштуку. Галоўны герой залежыць ад какаіну, які ён нюхае, высыпаўшы парашок на партрэт былой жонкі. Былая жонка залежыць ад цела свайго палюбоўніка, маладая фотамадэлька ад рэўнасці і скіраваных на ейную плоць позіркаў.

Бразільска–амерыканскі рэжысёр Эктар Бабенка, чый магутны талент расквітнеў у 1980–я на хвалі магічнага рэалізму, выяўляе спустошанасць і памылковасць аўтарскага кіно, якое нядаўна было на слыху.

Эратычныя фантазіі Федэрыка Феліні («8 1/2», «Горад жанчынаў»), сэксуальная жарсць як форма аўтарскага выказвання ( «Апошняе танга ў Парыжы» Бернарда Берталучы) — прыкметы ўсяго гэтага ў фільме Бабенкі ёсць. Але аўтар, як дэміюрг, — усяго толькі эгаістычны нарцыс, распешчаны ўласнаю пыхай і воплескамі.

Сёння воплескі сцішыліся, пыха не мае глебы, толькі мінулае не адпускае. Яно фальшывае, але вяртаецца ізноў і ізноў.

**Андрэй Расінскі**

Фільм з субтытрамі
**27, 28 у «Доме кіно»;**
**29 і 31 у «Перамозе»**

# Якасная адукацыя для Вашых дзяцей


PHOTO.BYMEDIA.NET

Каб трапіць у найлепшыя класы падавайце заявы проста 1 чэрвеня.

**Пачынаецца набор у першыя класы. Сем мінскіх школ прапануюць навучанне па-беларуску.** Іх перавага — інтэлігентны падбор дзяцей, невялікія класы, гімназічныя праграмы. Вашы малыя будуць вучыцца з дзецьмі дзеячоў культуры, бізнэсоўцаў, дактароў, навукоўцаў, урадоўцаў. Менавіта гэтае асяроддзе выбірае беларускамоўныя школы ў сталіцы. Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

### Гімназія № 4 (вул. Кунцаўшчына, 18)

Для прыёму дзяцей у першы клас іх законныя прадстаўнікі падаюць:

заяву на імя дырэктара гімназіі;

копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці;

даведку аб стане здароўя дзіцяці (форма № 026-У);

пашпарты бацькоў ці асобаў, што іх замяняюць, прад'яўляюцца асабіста.

Ад 2 да 6 чэрвеня — уступныя іспыты ў 5-я гімназічныя класы.

Даведкі: 315–33–83, 258–49–71, 258–49–74; e-mail: gymn4@minsk.edu.by.

### Гімназія № 9 (вул. Сядых, 10)

арганізуе прыём дакументаў у 1 клас **ад 1 чэрвеня да 28 жніўня**. Звяртацца ў каб. 22. Гімназія прапануе: вывучэнне ўсіх прадметаў на беларускай мове; вывучэнне англійскай, польскай, нямецкай моваў на факультатыўных занятках; прадметы музычнай накіраванасці; дадатковыя адукацыйныя паслугі за кошт факультатыўных заняткаў і платных паслуг.

Прымаюцца дзеці, якія пражываюць у Мінску. Пры адсутнасці мінскай прапіскі неабходна ўзгадніць прыём дзіцяці з упраўленнем адукацыі Першамайскага раёну.

Даведкі: (017) 283–04–21, 281–38–04.

### У гімназіі № 23 (пр. Незалежнасці, 45)

камісія па прыёме дакументаў у 1 клас працуе: **у няцотныя дні (I змена) — 10.00—14.00, цотныя дні (II змена) — 15.00—19.00, у першую суботу чэрвеня — 10.00—12.00.** Звяртацца ў каб.21.

Ад 2 да 6 чэрвеня вучні здаюць уступныя іспыты ў 5-я гімназічныя класы: 2 чэрвеня — Беларуская мова (дыктоўка); 4 чэрвеня — Матэматыка (кантрольная работа); 6 чэрвеня — Расійская мова (дыктоўка)

Ідзе і дадатковы набор на вольныя месцы ў 6 — 11 класы.

Даведкі: (107) 284–51–26, 284–87–16.

### У гімназіі № 28 (пр. Ракасоўскага, 93)

заявы ў 1 клас прымаюцца **да 25 траўня (цягам працоўнага дня, у тым ліку і ў суботы)**. Ад 2 па 6 чэрвеня пройдуць уступныя іспыты ў 5-я гімназічныя класы. Усе прадметы ў гімназіі выкладаюца на роднай мове, паглыбленa вывучаецца французская мова.

Даведкі: (017) 248–32–02, 248–12–64, e-mail: sch2@minsk.edu.by.

### Гімназія № 14 (вул. Васняцова, 10)

прымае заявы ў беларускамоўныя 1 класы. Прапануецца паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсы па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы. Дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Іспыты ў 5-я гімназічныя класы — ад 2 да 6 чэрвеня.

Даведкі: (017) 295–01–33, 295–21–31.

### СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19)

ажыццяўляе прыём дакументаў у першыя класы **ад 1 чэрвеня да 28 жніўня (настаўніцкая (I паверх) у панядзелак (10.00—14.00), сераду (16.00-20.00), пятніцу (10.00-14.00), суботу (10.00-13.00))**. Выкладанне адбываецца на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведкі: (017) 260–24–90; e–mail:sch190@minsk.edu.by

### СШ № 60 (вул. Лібкнехта, 82)

чакае першакласнікаў у беларускія класы. Школа мае музычную скіраванасць.

Даведкі: (017) 208–69–74, 209–94–49.

**Сямён Печанко**

«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 1—7 ЧЭРВЕНЯ

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 1 чэрвеня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 30 серыя
**19:00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім быў Кірыла Тураўскі?» (спазнаваўчая праграма)
**19.05** «Белы тэрор», дак. фільм, 2006 г., Францыя
**20.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.30** «Бульбаны», мультсерыял
**20.40** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 11 серыя: «Вакол Кіева»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.35** «Знакамітасць», маст. фільм, рэж. Вудзі Ален, 1998 г., ЗША. У ролях: Леанарда Ды Капрыё, Мэлані Грыфіт, Шарліз Тэран
**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 1 серыя
**00.10** Аб'ектыў (навіны)

### 2 чэрвеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 1 серыя
**18.55** «Усяго найлепшага!», дак. фільм, рэж. Роберт Латакаш, 2008 г., Венгрыя—Аўстрыя—Нямеччына
**20.15** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Хто ёсць кім: Уладзімір Някляеў
*Жыццё Уладзіміра Някляева — яскравы ўзор эвалюцыі творчай асобы ад паэта, запатрабаванага ўладамі, бо апяваў у вершах маладосць і шчасце ў духу калектывізму, да выдатнага майстра непаўторнай лірычнай індывідуальнасці.*
**21.35** Форум (ток–шоу): Кватэрнае пытанне
**22.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.50** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 2 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 3 чэрвеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 2 серыя
**18.55** «Рэквіем Незалежнасці», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**19.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**19.35** «Апошні сезон», серыял: 5 серыя
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Без рэтушы: «Чырвоны беларус», 2009 г., Польшча Герой рэпартажу — Мікалай Петрушэнка, актывіст Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ).
**21.45** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім быў Кірыла Тураўскі?» (спазнаваўчая праграма)
**21.50** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, рэж. Гелен Уітні, 1991 г., ЗША.
*Сацыяльная драма распавядае пра хлопчыка — уцекача з Камбоджы, якога ўсынавіла амерыканская сям'я. Дзіця спадзяецца на дапамогу новых бацькоў, каб тыя паспрыялі ягоным камбаджыйскім сваякам перабрацца ў Амерыку.*
**23.15** З архіву «Jazz Jamboree»: «Джэк Дэджонэт»
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 4 чэрвеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, рэж. Гелен Уітні, 1991 г., ЗША.
**19.35** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, рэж. Ян Сасіньскі, 2008 г., Польшча
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «У пошуку ідышу», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь
**23.00** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 9 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 5 чэрвеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 9 серыя
**19.05** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.30** «Па кім маўчыць звон?», дак. фільм, 2008 г., Польшча
**20.00** «Без рэтушы»: «Чырвоны беларус», 2009 г., Польшча
**20.25** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»
**21.30** «Познань'56», маст. фільм, рэж. Філіп Баён, 1996 г., Польшча.
**23.20** «Апошні сезон», серыял: 6 серыя
**00.10** Аб'ектыў (навіны)

### 6 чэрвеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, рэж. Рык Роўлі, 2003 г., ЗША
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.30** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Невядомая Беларусь: «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, рэж. Адам Галін, 2007 г., Беларусь
*Гэтая лаўка на Сонечнай вуліцы ніколі не пустуе. Тут размаўляюць, п'юць, спяваюць, танчаць, б'юцца, выклікаюць «хуткую дапамогу», спрачаюцца з міліцыяй, выпраўляюць на шпацыр дзяцей, ядуць і зноў п'юць жыхары рабочага інтэрнату адной мінскай фабрыкі. Вокны кватэры кінаапаратара Таццяны Логінавай выходзяць якраз на тую лаўку.*
**21.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.05** Суботні сеанс: «Шчырая праўда», маст. фільм, рэж. Пол Шапіра, 2004 г., ЗША—Канада.
*Ля вёскі секты амішаў знайшлі мёртвае немаўля. Усё паказвае на тое, што ў смерці вінаватая дзяўчына Кэці, якая, на думку ўсёй вёскі, і нарадзіла. Амішы паводле сваіх перакананняў не прымаюць гвалту і хлусні, а сама Кэці адмаўляе факты і сваёй цяжарнасці, і нараджэння дзіцяці...*
**23.35** «Мой свет нарадзіўся ў кузні», рэпартаж, 2008 г., Беларусь
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 7 чэрвеня, нядзеля

**18.00** Прэс–экспрэс
**18.15** «Ранча», серыял: 31 серыя
**19.05** «Ісабель Альендэ», дак. фільм, 2007 г.
**20.00** «Бульбаны», мультсерыял
**20.10** Форум (ток–шоу): Ці лёгка быць маладым?




**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Ці існаваў старажытнарускі народ» (спазнаваўчая праграма)
*За дзесяць стагоддзяў гісторыі Беларусі неаднаразова даводзілася сутыкацца з агрэсіяй Масквы., матываванай «абаронай праваслаўных жыхароў Беларусі». Царскія гістарыёграфы вылучылі тэзу пра існаванне старажытнарускай народнасці — «калыскі трох усходнеславянскіх народаў — расійцаў, украінцаў і беларусаў». Савецкая прапаганда падхапіла тэзу, замяніўшы панятак «рускі народ» на «савецкі», даючы падставу для падпарадкавання ды русіфікацыі. Для беларусаў гэта азначала асіміляцыю ды страту сваёй мовы і культуры.*
**21.25** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**21.55** Фільматэка майстроў: «Сонечная дзяржава», рэж. Марцін Шулік, 2005 г., Чэхія.
*Чацвёра сяброў з чэшскага індустрыйнага гораду Острава губляюць працу ў выніку прыватызацыі нерэнтабельнай фабрыкі. Ім удаецца пазычыць грошай, каб пачаць уласны бізнэс. Аднак знайсці кліентаў у эканамічна занядбаным чэшска–славацка–польскім памежжы не так і проста...*
**23.30** XIV фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень—2007»: выступ Змітра Вайцюшкевіча з «WZ Orchestra»
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Як дабіцца прызнання Абхазіі

Фельетон **Лёліка Ушкіна**.

Кабінет важнага супрацоўніка крамлёўскай адміністрацыі

**Паліткансультант** (уваходзячы): Можна?

**Чыноўнік:** Заходзь. Нешта не разумею сутнасці тваёй інструкцыі наконт нашай тактыкі перамоваў у Мінску. Ты пішаш: «На перамовы лепш за ўсё з’явіцца ў касцюмах ад «Камінтэрну», кашулях ад «Купалінкі», з гадзінікамі «Прамень». Прыкладна на 5-й хвіліне дыялогу зрабіць выгляд, што развязаліся матузкі на чаравіках. Паставіць нагу на крэсла і завязваць, каб суразмоўца заўважыў боты маркі «Марка». Пасля плаўна пераходзіць да тэмы Абхазіі. У выпадку ўскладнення перамоваў дастаць з кішэні барбарыскі ад «Камунаркі» і прапанаваць разам пагрызці»... Што за булшыт, як любіць казаць Лаўроў?

**Паліткансультант:** Усё проста і геніяльна. Проста іх кіраўнік патрабуе, каб насілі сваё і елі сваё. Натуральна, тыя шмоткі і семкі растопяць лёд недавеy і адкрыюць новыя перспектывы для інтэграцыі.

**Чыноўнік:** Ага. Разумею. Можа, для гарантыі дзве пары шкарпэтак?.

**Паліткансультант:** Як кажуць апошнія апытанні цэнтру Левада...

(У кабінет нечакана ўрываецца супрацоўнік ураду).

**Супрацоўнік ураду:** Палундра!

**Паліткансультант і чыноўнік** (разам): Што? Бакс каштуе 35 рублёў? Які я ідыёт, што ўчора не змяняў!

**Супрацоўнік ураду:** Чулі пра славянскі гей-парад у Маскве? Маўчанне.

**Супрацоўнік ураду:** Гэтая першая на маёй памяці расійска-беларуская грамадзянская акцыя, не фінансаваная ні з саюзнага бюджэту, ні з бюджэту БРСМ, ні з бюджэту мэрыі Масквы. Рэальнае праяўленне даўно чаканага славянскага адзінства. Афігець.

**Чыноўнік:** Ты хочаш сказаць, што ёсць вар’яты, якія вераць у славянскія шуры-муры не за грошы?

**Супрацоўнік ураду:** Так. Аднак інтрыга ў іншым: а што, калі гэта неяк звязана з...?

**Чыноўнік:** Ты хочаш сказаць, што калі заўтра на Маркса, 38 мы... хм... з’явімся ў калготках ад «Мілавіцы», тады прызнанне Абхазіі ў нас у кішэні?

**Супрацоўнік ураду:** Ну нашто так жорстка... Працяглага інтэграцыйнага пацалунку за зачыненымі дзвярыма, думаю, будзе дастаткова.

**Чыноўнік:** Я табе не Маісееў! Ясна?!

**Супрацоўнік ураду:** А табе ясна, што гэта, можа, апошні шанец дабіцца прызнання Удмурціі, Соры, Абхазіі. За намі Расія — а ты тут носам круціш.

**Чыноўнік:** Згодны абмяняцца доўгімі шматзначнымі поглядамі. Не больш.

**Супрацоўнік ураду:** Я сказаў пацалунак! Ты што — забыўся, дзякуючы каму ў гэтым крэсле сядзіш?

Пакуль чыноўнікі спрачаліся, паліткансультант унёс у тэкст сваёй інструкцыі важную папраўку: «Апроч кашулі ад «Купалінкі» і касцюму ад «Камінтэрну», падчас перамоваў на вас мусіць быць бялізна фірмы «Серж».

## СТОП-КАДР



Што б гэта значыла? Ніколі не здагадаецеся. Актор ва ўборы расійскага імператара Пятра I сядзіць на сімвалічным троне падчас творчай справаздачы Магілёўскай вобласці, прысвечанай 65-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мінск, Кастрычніцкая плошча. 22 мая.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## ЖАРТЫ

***

Калі мне было пятнаццаць гадоў, цыганка нагадала мне, што я буду выдаткоўваць многа грошай на жанчын. Цяпер мне трыццаць, і ў мяне жонка і тры дачкі.

***

Падчас ДТЗ з удзелам аўтамабіляў КДБ і КДК правілы дарожнага руху парушыліся самі.

***

Сядзяць у бары леў, воўк і свіння. Воўк кажа:

— Я калі завыю, дык мяне ўвесь лес баіцца!

Леў кажа:

— А майго рыку ўся савана баіцца!

Свіння, задуменна:

— А мне варта толькі кашлянуць...


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАННІ**

**Віншуем Аляксея і Наталлю Шэіных** з нараджэннем сына Якуба! Хай расце моцным і разумным, бацькам на радасць. Сябры і калегі

**Віншуем навукоўца Андрэя Казакевіча** з абаронай доктарскай дысертацыі ва Універсітэце Вітаўта Вялікага ў Каўнасе.

**Рух «За Свабоду» віншуе** рэгіянальнага дэмакратычнага лідэра, адраджэнца і рэжысёра Хрыстафора Жаляпава з Днём нараджэння. 100 гадоў! Жыве Беларусь і Хрыстафор!

**МАНЕЖ І ВАЗОК**

**У Ждановіцкім доме-інтэрнаце** выхоўваецца 3-гадовая Юля, якая пакутуе ад цэрэбральнага паралічу. Дзяўчынцы патрэбныя манеж і вазок для прагулак. Можна ўжываныя. Калі вы можаце падарыць ёй гэтыя рэчы, калі ласка, зрабіце гэта! Яны вельмі ёй патрэбныя! Т.: (017) 509-60-88

**СТУДЭНЦКІ КОНКУРС**

**Распавядзі сваю праўду пра сесію!** Дашлі на zbs.info@gmail.com фота альбо відэа (не болей за 5 хв.), прысвечаныя названай тэме і вазьмі ўдзел у конкурсе «Голая студэнцкая праўда пра сесію». Аўтары самых незвычайных і цікавых прац атрымаюць прызы. Дэдлайн 5 чэрвеня!

**КОЗЫ**

**Прадам** 2 казы. Т.: (017) 212-35-44.

**ПРАЦА**

**Шукаю сталую працу** рэдактара альбо стыль-рэдактара. Стаж працы — шэсць гадоў. Т.: 286-45-73, (044)704-82-71. Эдвард

**АРШАНСКАЯ БІТВА**

**Працягваецца падрыхтоўка да фэсту** беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская Бітва». Запрашаем беларускіх выканаўцаў да ўдзелу ў народным свяце. Для інфармацыі: vorsafest.livejournal.com. Сувязь: vorsha2009@gmail.com

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**Антон Астаповіч 31 траўня запрашае** ў краязнаўчае падарожжа ў Паазер’е па маршруце Мінск—Глыбокае—Гатаўшчына—Задарожжа—Гарадзец—Лужкі—Германавічы—Мінск. Кантакты: (017) 262-73-43, (029) 111-73-32

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Шмат людзей трохі ўжо чулі аб тым, што немцы, французы, амерыканцы цяпер выдумалі такія машыны, каторыя падымаюцца на паветра і ляцяць з людзьмі аж пад хмары, як птушкі. Мы цяпер ездзім па жалезнай дарозе, плаваем на параходах па моры, а праз 1—2 гады будзем пераляцаць з аднаго гораду ў другі па паветры, параганяючы арлоў. Вытлумачым, што гэта за штука «аэрастат» (карабель да лётання). Галоўная яго частка — гэта вялізны пузыр, надзьмуты асобным духам – вадародам. Вадарод гэты ў 16 разоў лягчэй за паветра, дык аэрастат і ляціць дзеля гэтага ўгору.

**«Наша Ніва». №20. 1909**


**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5715. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 26.05.2009.
Замова № 2808.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614